# УСТАЛЯВАНЫ ТЫСЯЧНЫ БАНКАМАТ «БЕЛАРУСБАНКА»

**ГЭТУЮ падзею самі супрацоўнікі банка назвалі «алімпійскай». Бо тысяча банкаматаў — гэта бясспрэчны рэкорд у карткавым бізнэсе краіны (кожны трэці банкамат у рэспубліцы належыць «Беларусбанку»). Юбілейнае ўстройства пачало працаваць у Лошыцы (Ігуменскі тракт, 20) у будынку нядаўна адкрытага аддзялення «Беларусбанка».**



Фота БЕЛТА.

Невыпадкова юбілейны банкамат дастаўся менавіта маладому мікраёну, які актыўна засяляецца. Сёння ў Мінску ўжо дастаткова ўсталявана такіх устройстваў самаабслугоўвання, і таму бліжэйшая задача банка — насычэнне новых мікрараёнаў банкаматамі і інфакіёскамі, каб людзі маглі атрымліваць банкаўскія паслугі непасрэдна там, дзе яны жывуць.

Дарэчы, першы банкамат банкам быў усталяваны ў 1998 годзе. Яго функцыі былі абмежаваны толькі магчымасцю атрымліваць наяўныя грошы і праглядаць рэшту на рахунку. А сучасныя банкаматы нават адрозніваюцца ад тых, што былі яшчэ пяць гадоў таму. Яны маюць павышаную ступень абароненасці і дазваляюць уладальнікам пластыкавых картак здзяйсняць шырокі спектр безнаяўных аперацый: атрымліваць міні-выпіску, плаціць за мабільную сувязь, хатні тэлефон, эфірна-кабельнае тэлебачанне, доступ у інтэрнэт, імгненна пераводзіць грашовыя сродкі з адной карткі на іншую. Пашырэнне функцый фактычна ператварае банкамат у міні-аддзяленне банка, якое дазваляе размеркаваць кліенцкія патокі, паменшыць нагрузкі на банкаўскіх работнікаў і пазбавіцца ад чэргаў. Акрамя таго, банкамат робіць паслугі банка больш даступнымі, бо карыстацца банкаўскімі сервісамі можна кругласутачна. Таму не дзіва, што сёння аб'ёмы грашовых сродкаў, якія атрымліваюць кліенты ў банкаматах, у пяць разоў перавышаюць аб'ёмы выдачы наяўных грошай у аддзяленнях.

Нядаўна банк пачаў устанаўліваць новыя віды банкаматаў з функцыяй Cash-in, а на вуліцы Якубоўскага, побач з заводам святлопрыбораў, дзе пераважна працуюць людзі з парушэннем зроку, з'явіўся такі банкамат, якім могуць карыстацца людзі, якія дрэнна бачаць. Гэтае ўстройства аснашчана кнопкамі, якія дазваляюць навобмацак знайсці патрэбную клавішу. Людзі з аслабленым зрокам змогуць разабраць больш выразныя надпісы на кантрасным экране. Акрамя таго, аперацыі на банкамаце суправаджаюцца галасавой падтрымкай — чалавек чуе падказку, як яму дзейнічаць.

— Адной са стратэгічных задач банка з'яўляецца давядзенне банкаўскіх паслуг максімальна блізка для нашых кліентаў, каб гэта было зручна і даступна ў любы час, — зазначыў **намеснік дырэктара разліковага цэнтра пластыкавых карт ААТ «АСБ Беларусбанк» Генадзь СЕРЫ**. — Акрамя таго, што мы ўстанаўліваем банкаматы, банк сёння валодае дастаткова шырокай сеткай інфакіёскаў, якія больш арыентаваны на тое, каб кліенты маглі здзяйсняць безнаяўныя плацяжы (у адрозненне ад банкаматаў у інфакіёсках сёння нельга атрымаць наяўныя грошы). Акрамя таго, зараз мы актыўна развіваем дыстанцыйныя банкаўскія сервісы: інтэрнэт-банкінг, Мабільны банк, СМС-банк. Гэтыя паслугі па меры іх развіцця дазваляюць нашым кліентам здзяйсняць банкаўскія аперацыі, не выходзячы з дома.

Між іншым, у свеце зараз працуе каля двух з паловай мільёнаў банкаматаў. А самы першы банкамат з'явіўся ў 1967 годзе ў Англіі. Адзін з кліентаў банка, які на хвіліну спазніўся ў банк, каб атрымаць грошы, прыдумаў банкамат, а за аснову ўзяў апарат, які выдаваў шакаладкі. З першых банкаматаў грошы здымаліся пры дапамозе ваўчара, які нагадваў чэк. Чэк трэба было закупіць у банку. Штуршком для развіцця банкаматнага бізнэсу паслужыла з'яўленне ў 1976—77 гадах пластыкавых картак. Сёння банкаматы моцна мадэрнізуюцца. У некаторых краінах ужо ўсталяваны біяметрычныя банкаматы, для карыстання якімі не патрэбна картак: разумная машына вызначае кліента па адбітках пальца ці сятчатцы вока.

Я пацікавілася ў кіраўніка тэхнічнага ўпраўлення Анатоля Чарняціна, ці не з'явяцца ў бліжэйшы час біяметрычныя банкаматы і ў Беларусі. Па яго словах, такое пытанне ўжо разглядалася. Але, каб увесці такую паслугу, неабходная моцная мадэрнізацыя працэсінгавага цэнтра і банкаматаў, што даволі дорага. Таму ўстанаўліваць біяметрычныя банкаматы пакуль не плануецца.

— Якія б парады вы далі кліентам, што карыстаюцца банкаматамі? — пацікавілася я ў Генадзя Серага.

— Быць уважлівымі. Уважліва сачыць за паведамленнем на экране, гукавым суправаджэннем. Не мітусіцца, калі нехта адцягне ўвагу кліента, — праз 30-40 секунд банкамат можа забраць картку. Устройства павінна гэта зрабіць у мэтах бяспекі кліента. А калі раптам з чалавекам нешта здарылася, — напрыклад, стала дрэнна? Нельга аддаваць картку іншым людзям ці гаварыць свой пін-код. Яна — як ваш уласны кашалёк, але з адной асаблівасцю: згубіўшы картку, вы не згубіце грошы.

З'яўляючыся бясспрэчным лідарам на карткавым рынку Беларусі, банк будзе працягваць развіваць сэрвісы самаабслугоўвання. Сёлета ў рэспубліцы плануецца ўсталяваць яшчэ каля 30 банкаматаў, 10 з якіх — у сталіцы.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Арэнда жылля

# КВАТАРАНТЫ НЕ МОГУЦЬ БОЛЬШ, А ГАСПАДАРЫ НЕ ХОЧУЦЬ МЕНШ

**КАЛІ тыдзень таму я згадзіўся дапамагчы свайму даўняму сябру з Лепеля, якому неабходна было адшукаць здымнае жыллё для дачкі-студэнткі ў Мінску, то нават і не ўяўляў, з якімі праблемамі можна сутыкнуцца ў гэтай сферы за «паўкроку» да восені.**

### Таннай прапановы амаль не засталося

Яшчэ ў першыя дні жніўня пэўная частка маладых людзей актыўна шукала сабе здымнае жыллё. Попыт і цэны тады былі мінімальныя, аднак... Навошта здымаць жыллё загадзя, калі вучыцца ты пачынаеш у верасні? Згодзен, але...

Менавіта цяпер у сталіцы назіраецца вельмі вялікая хваля павелічэння попыту на здымнае жыллё з боку студэнтаў і не толькі. Калі кліентаў становіцца вельмі шмат, то рынак не паспявае аднаўляцца і прапанова звужаецца да мінімуму.

Дачка майго таварыша хацела зняць невялікую кватэрку з мэбляй не даражэй за 170 долараў у эквіваленце па Нацбанку. Дзяўчынка ўжо адшукала сабе прыяцельку на кватэру, тады кожнай было б плаціць па 425 тысяч рублёў плюс палову камуналкі. Для лепельскіх заробкаў грошы вялікія, але «выцягнуць» магчыма. Кватэру трэба было адшукаць побач са станцыяй метро «Маскоўская».

Мне здавалася, што заказ даўняга сябра я выканаю лёгка, бо недзе месяц-два таму звычайная аднапакаёвая кватэра каштавала 150—170 долараў. Праблем не было ніякіх.

Цяпер цэннікі сур'ёзна змяніліся. Паводле інфармацыі **агента па аперацыях з жыллёвай нерухомасцю агенцтва нерухомасці «Дзінас» Іны КУЛЬША**, мінімальны цэннік самых «слабенькіх» аднапакаёвых кватэр без мэблі ў Заводскім раёне або ў новабудоўлях складае не менш за 180—190 долараў плюс кватрплата. Па такім кошце кватэры часткова з мэбляй атрымліваюць сабе новых гаспадароў амаль імгненна. Але нават па такім завышаным кошце на слабенькае жыллё танных кватэр не хапае менавіта для студэнтаў. Традыцыйна гаспадары ўтульных маленькіх кватэр даволі асцярожна ставяцца да студэнтаў. Калі я непасрэдна спрабаваў дамовіцца з гаспадарамі падобнага жылля, то апошніх цікавіла тое, як далёка жывуць бацькі студэнтаў, а таксама хто будзе непасрэдна адказваць за стан кватэры, калі што здарыцца? Адказваць «па поўнай» (падпісваць пэўную паперу) за дачку сябра і яе прыяцельку я адмаўляўся.

### Аднапакаёўка — зноў 200 USD?

У асобных інтэрнэт-парталах кліентам прапануецца часам і таннейшае віртуальнае жыллё, але... Наш эксперт спадарыня Кульша адзначае, што сярэдні цэннік стандартных аднапакаёвых кватэр у спальных раёнах складае ўжо не менш за 200 долараў. Больш якаснае жыллё такога рангу каштуе 220—230 долараў, а невялікія кватэркі бліжэй да цэнтра і побач са знакавымі буйнымі навучальнымі ўстановамі дасягаюць ужо 250 долараў.

Невялікая кватэрка недалёка ад станцыі метро «Маскоўская» (чатыры прыпынкі на аўтобусе) мела мінімальны цэннік у межах 200 долараў. Аднак гаспадыня брала плату ці толькі ў валюце, ці па курсе 7 тысяч за 1 USD. У гэтым выпадку кошт арэнды дасягае ўжо 1,4 млн рублёў плюс аплата камуналкі. Атрымліваецца 700—770 тысяч рублёў толькі за жыллё — такіх выдаткаў мой сябра «пацягнуць» ужо не мог.

### Двухпакаёўкі падаражэлі прыкладна на 30 USD

Якраз гэтымі днямі ўслед за ліквіднымі аднапакаёвымі кватэрамі павялічыліся цэннікі і на двухпакаёўкі. Цяпер звычайныя двухпакаёвыя кватэры невялікіх плошчаў у старых мікрараёнах, бліжэй да кальцавой па вуліцы Казінца, у Чыжоўцы і Шабанах прапануюцца не танней чым за 220—230 долараў. Гэта не зусім стандартнае жыллё, бо галоўным чынам па такім цэнніку існуюць кватэры без мэблі і не ў лепшым стане. Сярэдні кошт ліквідных аднапакаёвак дасягае ўжо 250—300 долараў. Сапраўды якасныя кватэры з сучаснай мэбляй каштуюць да 350 долараў, а бліжэй да цэнтра — 420—500 USD і больш.




Каб адшукаць больш-менш таннае жыллё, апошнім часам студэнты пачалі «кампанавацца» і здымаць шматпакаёвыя кватэры. Для 3—4 чалавек, а часам і больш, здымаецца трохпакаёвая кватэра. Самыя спрыяльныя прапановы па трохпакаёвых кватэрах існуюць у далёкіх новабудоўлях побач з кальцавой дарогай. У новых дамах вялікія па плошчы кватэры без мэблі прапануюцца яшчэ за 250—300 долараў. Калі падзяліць агульны цэннік арэнды на ўсіх жыхароў, то атрымліваецца і параўнальна нядорага. Праўда, тут існуе адно сур'ёзнае «але»... У новых кватэрах звычайна зарэгістраваны толькі адзін гаспадар, таму зімой памер камунальных плацяжоў можа павялічвацца даволі моцна. Справа ў тым, што за ацяпленне лішняй плошчы, у залежнасці ад колькасці зарэгістраваных жыльцоў, трэба будзе плаціць ужо ўдвая больш. Сярэдні кошт трохпакаёвых кватэр з мінімальным наборам мэблі і бытавой тэхнікі складае 350—420 долараў. Бліжэй да цэнтра нават сярэднія па плошчы трохпакаёўкі каштуюць ад 430 да 550 долараў.

### Трэба дамаўляцца з улікам доўгатэрміновай перспектывы

Спецыялісты рынку арэнды сталічнай нерухомасці адзначаюць, што цяпер у агенцтвах існуе шмат заявак на таннае і ўтульнае жыллё для сваіх дзетак менавіта з боку бацькоў першакурснікаў. Кліенты жадаюць здымаць кватэры коштам да 150—180 долараў. Больш за тое, іншагароднія згаджаюцца плаціць толькі ў рублях і па курсе ў абменніках. Вось тут узнікае сутыкненне інтарэсаў, бо гаспадары сталічных кватэр трымаюць кошты да апошняга, а калі згаджаюцца прымаць плату ў рублях, то долар лічыцца ўжо не менш як 6,5—7,8 тысячы рублёў.

Так, на хвалі ажыятажнага попыту патэнцыяльныя кватаранты будуць вымушаны здымаць дарагія кватэры. Аднак праз месяц або два грошы ў бацькоў студэнтаў закончацца, пасля чаго кліенты пачнуць масава адмаўляцца ад дарагой арэнды і будуць шукаць іншыя варыянты вырашэння жыллёвай праблемы.

### Павялічыцца попыт на асобныя пакойчыкі

Сучасныя студэнты сёння хочуць жыць самастойна і ў камфортных умовах, але... Цяперашнія заробкі не заўсёды дазваляюць выконваць пажаданні маладых. Наш эксперт спадарыня Кульша не рэкамендуе бацькам «зялёных» студэнтаў адразу ў першы год прапаноўваць сваім дзеткам поўную свабоду. Лепш пашукаць асобны пакойчык у стандартнай шматпакаёвай кватэры, дзе пад прыглядам гаспадыні маладыя студэнты будуць і сапраўды ўпарта вучыцца. Часта так адбываецца, што цалкам адэкватныя людзі пры поўнай свабодзе вельмі хутка мяняюцца, і далёка не ў лепшы бок. Пакойчык на аднаго чалавека цяпер каштуе 80—100 долараў. Калі ў пакойчыку жывуць два студэнты, то з кожнага бяруць па 50—60 долараў.

Калі прынята рашэнне, што студэнты павінны жыць у кватэры, тады маладых людзей трэба падрыхтаваць да самастойнага жыцця. Часта гаспадары кватэр не жадаюць мець спраў са студэнтамі, бо на гэта існуюць прычыны. Часам маладыя не ўяўляюць, як трэба падтрымліваць парадак у чужой кватэры.

Уласнікі параўнальна якасных кватэр павялічваюць цэннік менавіта для студэнтаў, бо спрабуюць такім чынам засцерагчы сябе ад магчымых праблем з рамонтам. У гэтым выпадку бацькі могуць пісьмова паабяцаць гаспадарам жылля падтрымліваць кватэру ў ідэальным стане. Аднак тады неабходна будзе наведваць сваіх дзяцей мінімум раз на тыдзень на працягу некалькіх месяцаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СПАДЧЫНЫ ШМАТ, А ДЛЯ ЯЕ ЗАХАВАННЯ НЕ ХАПАЕ КАДРАЎ

**У Косаўскім палацы можна будзе жыць, у Мінску з'явіцца музейны квартал, у Нясвіжскім замку будуць паказваць рэстаўрацыйныя работы, а інтэр'ер Спаса-Ефрасіннеўскай царквы будзе такім жа, якім яго бачыла Ефрасіння Полацкая. Аб усім гэтым стала вядома на прэс-канферэнцыі «Мерапрыемствы па ахове і рэстаўрацыі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі», якая адбылася ў Грамадскім прэс-цэнтры.**

**Ігар ЧАРНЯЎСКІ, начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры**, паведаміў, што сёння ў дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў 5397 аб'ектаў. Па яго словах гэта і помнікі архітэктуры, і помнікі археалогіі, і гісторыі, і мастацтва. «Але нам называлі ў свой час такую лічбу: патэнцыял Беларусі — 15679 аб'ектаў», — сказаў чыноўнік.

Зараз рэстаўрацыйныя работы праводзяцца на пятнаццаць асноўных аб'ектаў. Сярод якіх замкавы комплекс у Міры, Нясвіжскі палацава-паркавы ансамбль. У апошнім сёлета асноўныя работы амаль завершаны, хоць некаторыя з іх нельга праводзіць хуткімі тэмпамі. Таму цалкам рэстаўрацыя пакуль што не спыніцца. «Можа быць, упершыню ў Беларусі будзе зроблена такое: самі рэстаўрацыйныя работы могуць стаць на пэўны перыяд «музейным экспанатам», калі наведвальнікі змогуць пазнаёміцца непасрэдна з працэсам рэстаўрацыі», — заявіў Ігар Чарняўскі. Таксама прынята наступнае рашэнне: Нясвіжскі замак павінен быць такім, якім ён дайшоў да нашага часу пасля значнай рэканструкцыі ў XVIII стагоддзі, — гэта значыць, у барочным стылі. Элементы іншых стыляў будуць выяўлены толькі ў некаторых парталах, абрамленнях...

Працягваюцца работы па комплексе будынкаў Нацыянальнага мастацкага музея. «Пасля іх завяршэння ў Мінску ўтворыцца, як мы яго называем, музейны квартал. Таксама там будзе знаходзіцца рэстаўрацыйны цэнтр музейных прадметаў. Такога цэнтра пакуль у нас няма». Гэты квартал будзе ўключаць будынкі па вуліцах Кірава, Леніна, Маркса. Фактычна, можна будзе зайсці ў музей і, не выходзячы на двор, прайсці па ўсіх памяшканнях.

Яшчэ адзін сюрпрыз для турыстаў будзе ў Полацку, дзе зараз ідзе рэканструкцыя Спаса-Ефрасіннеўскай царквы. « Пасля мы ўбачым цалкам аднаўлены інтэр'ер царквы XII стагоддзя такім, якім яго, напэўна, бачыла сама Ефрасіння Полацкая».

Што тычыцца рэстаўрацыі Косаўскага палаца, то ў перспектыве турысты змогуць не толькі наведваць і разглядаць яго, але і жыць у ім. «Ён прызначаецца менавіта для такіх мэт».

Таксама чыноўнік расказаў аб праблемах, з якімі даводзіцца сутыкацца. Асноўная з іх — кадравы голад. «Калі яшчэ ў аблвыканкамах ва ўпраўленнях культуры працуюць канкрэтныя спецыялісты, — растумачваў Ігар Чарняўскі, — то ў раёнах далёка не ўсюды ёсць такія. Напрыклад, у адным з раёнаў Магілёўскай вобласці прызначылі такім спецыялістам тэхнічнага работніка аддзела культуры райвыканкама».

Яшчэ адна праблема — немагчымасць рэканструкцыі некаторых аб'ектаў. «Згодна з праектам «Замкі Беларусі», Навагрудскі замак будзе закансерваваны, бо няма дастатковых звестак для аднаўлення. Сюды адносіцца і Крэўскі замак, Гальшанскі, Быхаўскі».

Міністэрства культуры таксама турбуе, што рабіць з вельмі запушчанымі аб'ектамі. «Гістарычныя аб'екты, якія не выкарыстоўваюцца і знаходзяцца ў вельмі дрэнным становішчы, будуць прадавацца прыватным асобам за адну базавую велічыню. Гэта ідэя зараз прапрацоўваецца. Але, магчыма, цана падчас аўкцыёну будзе расці ў залежнасці ад попыту на аб'ект».

Але нягледзячы на цяжкасці, плануюцца новыя рэстаўрацыі. Напрыклад, Старога замка ў Гродне. Аб гэтым паведаміў **Сяргей МАЦІЕВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама**: «Архітэктурны праект ужо распрацаваны. Работу распачаць плануецца ў 2013 годзе».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## 437 МІЛЬЯРДАЎ РУБЛЁЎ КАНФІСКАВАНЫ Ў ВАЛЮТЧЫКАЎ

**Такі папярэдні вынік барацьбы з чорным рынкам валюты ў Магілёўскай вобласці.**

Ад пачатку сакавіка вядуць актыўную працу па супрацьдзеянні незаконным валютным аперацыям супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю Магілёўскага УУС і ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Магілёўскай вобласці.

У выніку выяўлена 98 парушэнняў парадку валютных абменных аперацый. Пад крымінальны пераслед трапілі чатыры чалавекі. Затрыманні адбыліся ў Бабруйску і Асіповічах, сярод парушальнікаў ёсць мінчане. За канфіскаваныя грошы ў амаль палову мільярда рублёў можна было б, напрыклад, набыць аўтобус альбо укамплектаваць камп'ютарныя класы для некалькіх школ.

Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута больш за два дзясяткі чалавек, якія скарысталіся паслугамі валютчыкаў. Як вядома, у такіх кліентаў не толькі канфіскуюць грошы, але і прызначаюць штраф у памеры да 100 базавых велічынь.

**Алена КАЗЛОВА.**

## Абзац

◢ **Мінская вобласць выканала дзяржзаказ па здачы збожжа. Гаспадаркі сталічнага рэгіёна паставілі ў лік дзяржзаказу 240 тыс.т збожжа, што складае 100 працэнтаў плана. Гэта другая вобласць пасля Віцебскай, якая паспяхова выканала план дзяржзаказу.**

◢ Нямецкую авіябомбу часоў Вялікай Айчыннай вайны знайшлі рабочыя, якія капалі катлаван, на будпляцоўцы ў раёне вул. Быхаўская. Першапачаткова яна знаходзілася на глыбіні каля 1,5 м. Міліцыя аператыўна ачапіла месца вакол небяспечнай знаходкі і правяла эвакуацыю грамадзян. Сапёры вызначылі, што бомба мела вагу 50 кг з выбуховым рэчывам магутнасцю каля 20 кг у тратылавым эквіваленце. На спецыяльным аўтамабілі авіябомбу перавезлі на падрыўную пляцоўку за межамі горада.

◢ **На памежны пункт пропуску «Беняконі» Ашмянскай мытні прыбыў аўтамабіль «ДАФ», які рухаўся з Літвы ў Беларусь. Згодна з дакументамі з Новай Зеландыі ў адрас адной з беларускіх фірмаў перавозілася партыя сталёвага профілю Пры аглядзе грузу ў супрацоўнікаў мытні з'явілася сумненне, што профіль выраблены са сталі. Вырашылі правесці мытную экспертызу. Паводле заключэння эксперта, профіль выраблены з алюмінію. Мытная пошліна на металічны профіль з алюмінію значна вышэйшая па кошце, чым са сталі. У выніку партыя алюмініевага профілю агульным коштам больш Br1 млрд канфіскавана.**

◢ Першы ў Беларусі банкамат для інвалідаў-калясачнікаў установяць у лістападзе ў Мінску на скрыжаванні вуліц Батанічная і Даўгабродская. Банкамат зроблены спецыяльна для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія бесперашкодна змогуць пад'ехаць да яго на інваліднай калясцы па пандусах. Істотным адрозненнем банкамата стане тое, што ён будзе значна ніжэйшы за стандартныя. Дарэчы, сёлета ў беларускай сталіцы ўжо ўстаноўлены банкамат, прызначаны для людзей з парушэннямі зроку.

◢ **Шасцігадовы хлопчык загінуў пад коламі трактара ў Жлобінскім раёне. Трагедыя адбылася 23 жніўня ў поле ў вёскі Дзяніскавічы. Трактарыст, накіроўваючыся пасля абеду на працу, падвёз да поля двух унукаў — 8-гадовую дзяўчынку і яе 6-гадовага брата. Высадзіўшы дзяцей, якія павінны былі вяртацца ў вёску, ён паехаў далей. Пры гэтым мужчына не заўважыў, што хлопчык заскочыў на прычэп і падчас руху трактара апынуўся пад яго коламі.**

◢ З канвеера ААТ «Беларускі аўтамабільны завод» 24 жніўня сышоў двухтысячны кар'ерны самазвал грузападымальнасцю 55 т. Юбілейная машына будзе адпраўлена пастаяннаму спажыўцу беларускага прадпрыемства — ААТ «Вугальная кампанія «Кузбасразрэзвугаль» у Расіі. Першыя машыны грузападымальнасцю 55 т пачалі выпускаць на Белазе 15 гадоў таму. Самазвал вельмі запатрабаваны, і на прадпрыемства пастаянна паступаюць заяўкі ад спажыўцоў на яго пастаўку ў горнарудныя кар'еры.

◢ **У пункце мытнага афармлення «Казловічы» на беларуска-польскай мяжы затрымана 6 т клубняў элітных кветак. Кантрабандны груз знойдзены ў аўтацягніку, які рухаўся з Галандыі ў Расійскую Федэрацыю. Для таго, каб параўнаць фактычную колькасць тавара з лічбамі, паказанымі ў суправаджальных дакументах, мытнікам давялося пералічыць усё 17 т грузу, які перавозіўся, на што пайшло 6 дзён. У выніку неадпаведнасць склала 78 тыс. штук цыбулін.**

◢ Бабруйскім міжгарнізонным ваенным судом да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 1 год з адтэрміноўкай яго выканання на 1 год асуджаны сяржант адной з воінскіх часцей Аршанскага гарнізона. Як высветлілася, асуджаны, будучы дзяжурным па роце, стаў сведкам неўстаўных адносін з боку стараслужачых да навабранцаў, але не спыніў гэтых супрацьпраўных дзеянняў і не далажыў аб іх непасрэднаму начальніку.

◢ **У вёсцы Князева Зэльвенскага раёна на вуліцы са слядамі збіцця выяўлены труп непрацуючага жыхара вёскі Падбалоцце1960 года нараджэння. Экспертыза ўстанавіла, што смерць мужчыны наступіла ад чэрапна-мазгавой траўмы, пераломаў рэбраў і разрываў унутраных органаў. Высветлілася, што яго падчас сваркі збілі два мясцовых падлеткі — навучэнец Магілёўскага спецыяльнага прафесійна-тэхнічнага вучылішча закрытага тыпу і вучань 7-га класа Князеўскай гімназіі.**

◢ 34-гадовая санітарка адной са сталічных бальніц зарабляла опіем. Міліцыю выклікалі суседзі, калі пах, які даносіўся з кватэры насупраць, стаў невыносны. Аператыўнікі затрымалі гаспадыню на месцы злачынства. Пры аглядзе ў кватэры выявілі 32 бутэлькі опію, большая частка з якіх была схавана, а астатнія проста валяліся на падлозе. Жанчына мае двое дзяцей, якіх у яе ўжо ў другі раз забралі ў дзіцячы дом, а яе муж 5 разоў пабываў за кратамі за захоўванне наркатычных сродкаў і ўтрыманне прытона ў сябе дома.

◢ **Навукоўцы з Галандскай арганізацыі па прыкладных даследаваннях вызначылі, што самым бяспечным для навакольнага асяроддзя спосабам пахавання з'яўляецца рэсамацыя — гідроліз цела ў шчолачным асяроддзі. На другім месцы апынулася крыямацыя, а замыкаюць спіс крэмацыя і звычайнае пахаванне.**

## Поўны абзац

◢ Канадскі школьнік паспяхова прыняў роды ва ўласнай маці. Яму ўдалося акуратна выняць дзіця з радавых шляхоў, пасля чаго з дапамогай нажніц і заціску, які знайшоўся дома, перарэзаць пупавіну. Як пасля расказаў хлопчык, яму дапамаглі прагледжаныя раней тэлеперадачы пра тое, як праходзяць роды, і некалькі кніг на гэтую тэму з хатняй бібліятэкі.

◢ **Суд Лос-Анджэлеса прыняў рашэнне арыштаваць 59-гадовага бізнэсмена за кармленне галубоў. Каля года назад мужчына пачаў сістэматычна падкормліваць птушак непадалёк ад аэрапорта Боб-Хоўп, ад чаго іх папуляцыя ў гэтым раёне значна павялічылася. Па словах пілотаў, зараз сутыкненні самалётаў з птушкамі здараюцца кожны месяц.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» ИНФОРМИРУЕТ:**

Лот № 1: здание телемастерской (инв. № 623/С30590), об. пл. 215,4 кв.м, расположенное по адресу: Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, пл. Свободы, д. 3 – **СНИМАЕТСЯ С АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ**, назначенных на 13.09.2011.

*Извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 09.08.2011.*

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

# У ГОМЕЛІ ВЫНЕСЕНЫ ПРЫГАВОР ПА БУЙНЫМ КРАДЗЯЖЫ МАТЭРЫЯЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ ФІЛІЯЛА БЕЛТЭЛЕКАМА

**СУД Чыгуначнага раёна Гомеля вынес абвінаваўчы прыгавор тром грамадзянам, якія выкрадалі таварна-матэрыяльныя каштоўнасці РУП «Белтэлекам». Памер урону, нанесенага прадпрыемству іх дзеяннямі, склаў Br500 млн, паведамілі БЕЛТА ў прэс-групе УКДБ па Гомельскай вобласці.**

Сярод асуджаных былы старшы электрамеханік лінейных збудаванняў сувязі і абаненцкіх устройстваў кабельнай групы лінейнага цэха Гомельскага гарадскога вузла электрасувязі Гомельскага філіяла РУП «Белтэлекам», мантажнік (інжынер) сувязі рамонтна-будаўнічай вытворчасці гэтага ж прадпрыемства, а таксама дырэктар адной з гомельскіх камерцыйных структур.

Супрацоўнікі ўпраўлення КДБ Беларусі па Гомельскай вобласці спынілі іх злачынную дзейнасць у 2008 годзе. У ходзе следства было ўстаноўлена, што ў перыяд з 2004 па 2008 гады старшы электрамеханік і мантажнік выкрадалі новы кабель для правядзення рамонтных работ і іншыя таварна-матэрыяльныя каштоўнасці, за якія неслі адказнасць. Маёмасць прадпрыемства незаконна спісвалася, а затым рэалізоўвалася прадстаўнікам камерцыйных фірм. Ажыццяўлялася гэта як за наяўны разлік, так і шляхам паставак па падробленых дакументах ад імя лжэпрадпрымальніцкіх структур.

Акрамя таго, старшы электрамеханік кіраваў работнікамі, якія праводзілі планавыя і аварыйныя рамонты лінейна-кабельных збудаванняў сувязі. Следствам былі сабраны доказы, што ён, выкарыстоўваючы службовыя паўнамоцтвы, неаднаразова накіроўваў электраманцёраў і кабельшчыкаў папрацаваць у інтарэсах некаторых камерцыйных прадпрыемстваў.

Паводле матэрыялаў справы, у 2006 годзе з работнікамі РУП «Белтэлекам» на пастаяннай аснове стаў «супрацоўнічаць» дырэктар камерцыйнай структуры, якая працавала ў сферы электрасувязі. Фірма займалася тэлефанізацыяй розных прадпрыемстваў і арганізацый. Яе кіраўнік неаднаразова набываў таварна-матэрыяльныя каштоўнасці ў работнікаў Гомельскага філіяла РУП «Белтэлекам», ведаючы аб іх крымінальным паходжанні, а таксама незаконна выкарыстоўваў працу работнікаў ГУЭС.

Раённы суд прызнаў фігурантаў па справе вінаватымі ў растраце даручанай маёмасці, учыненай групай асоб па папярэдняй змове, у асабліва буйным памеры. Былы старшы электрамеханік прызнаны вінаватым і ў злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі. Яму назначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 4 гады і 6 месяцаў, з канфіскацыяй маёмасці. Мантажнік сувязі прыгавораны да 4 гадоў абмежавання волі, з канфіскацыяй маёмасці. Кіраўнік камерцыйнай структуры, які «супрацоўнічаў» з работнікамі РУП «Белтэлекам», прызнаны вінаватым у легалізацыі матэрыяльных каштоўнасцяў, набытых злачынным шляхам, і прыгавораны да 4 гадоў пазбаўлення волі, з канфіскацыяй маёмасці. Усе трое пазбаўлены права займаць матэрыяльна адказныя і кіруючыя пасады тэрмінам на 3 гады.

Актуальна

# Веды «даражэюць»

**МІНІСТЭРСТВАМ адукацыі зацверджаны памер платы за карыстанне школьнымі падручнікамі ў 2011/2012 навучальным годзе. Як і ў папярэднія гады, бацькі будуць аплачваць толькі 50 працэнтаў ад кошту школьных падручнікаў. Тым не менш для сем'яў старшакласнікаў падручнікі атрымліваюцца зусім не танныя. Асабліва гэта адчуюць бацькі, у якіх у сям'і двое дзяцей-школьнікаў.**

Для першакласнікаў карыстанне камплектам падручнікаў будзе каштаваць 19 750 рублёў. Для вучняў 2-х класаў — 17 260 рублёў, для 3-х класаў — 15 330 рублёў, для 4-х — 15 740 рублёў, для 5-х — 14 480 рублёў, 6-х — 18 910 рублёў, 7-х — 25 970 рублёў, 8-х — 35 590 рублёў, 9-х — 41 150 рублёў, 10-х — 34 240 рублёў і 11-х — 29 900 рублёў.

У адпаведнасці з Кодэксам аб адукацыі, ад унясення платы за карыстанне падручнікамі вызваляюцца: навучэнцы санаторных школ-інтэрнатаў, спецыяльных вучэбна-выхаваўчых і спецыяльных лячэбна-выхаваўчых устаноў адукацыі; асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця; дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без бацькоўскай апекі; дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў і інваліды з дзяцінства; асобы, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, хворыя на анкалагічныя захворванні ці хворыя на туберкулёз; дзеці з сем'яў, якія ў адпаведнасці з заканадаўствам атрымліваюць дзяржаўную дапамогу на дзяцей ва ўзросце, старэйшым як 3 гады; навучэнцы з сем'яў, у якіх адзін ці абодва бацькі з'яўляюцца інвалідамі I ці II груп і некаторыя іншыя катэгорыі.

Для навучэнцаў са шматдзетных сем'яў (тры і больш дзяцей) плата за карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі зніжаецца на 50 працэнтаў ад устаноўленай платы. Для прыняцця рашэння аб бясплатным карыстанні падручнікамі або зніжэнні платы за карыстанне падручнікамі з бацькоў школьнікаў запрошваюцца даведкі аб памеры прызначанай дапамогі на дзяцей ва ўзросце старэйшым як 3 гады і перыядзе яе выплаты, а са шматдзетных сем'яў — аб месцы жыхарства і складзе сям'і.

Плата за карыстанне вучэбнай літаратурай уносіцца да 1 кастрычніка ў мясцовыя аддзяленні «Беларусбанка».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Мінскі гарадскі тэрытарыяльны фонд дзяржаўнай маёмасці выказвае глыбокае спачуванне начальніку аддзела каштоўных папер і арганізацыі таргоў фонду «Мінскгармаёмасць» АМЕЛЯШКА Алене Васільеўне ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю БАЦЬКІ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 14 октября 2011 года проводит 16-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км/наработка в м/ч (износ) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 134 | Автошасси Урал-375, ш. 426051, дв. 208793, 1984 года выпуска, 4 кат. | г. Воложин, в/ч 30695 | 1984 | 8 235 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 135 | Автошасси Урал-375, ш. 381417, дв. 698346, 1983 года выпуска, 4 кат. | г. Воложин, в/ч 30695 | 1983 | 4 897 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 136 | Автошасси Урал-375, ш. 382393, дв. 693319, 1982 года выпуска, 4 кат. | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 1982 | 1 169 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 137 | Автошасси Урал-375, ш. 382112, дв. 690020, 1982 года выпуска, 4 кат. | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 1982 | 1 127 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 138 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 104785, дв. 680619, 1988 года выпуска, 3 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1988 | 79 041 | 31 000 000 | 3 100 000 |
| 139 | Автошасси Урал-4320, ш. 026935, дв. 232570, 1984 года выпуска, 4 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1984 | 138 985 | 17 000 000 | 1 700 000 |
| 140 | Автошасси Урал-4320, ш. 046567, дв. 819857, 1985 года выпуска, 4 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1985 | 133 060 | 17 000 000 | 1 700 000 |
| 141 | Автошасси Урал-4320, ш. 043386, дв. 792629, 1985 года выпуска, 4 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1985 | 133 092 | 17 000 000 | 1 700 000 |
| 142 | Автошасси Урал-4320, ш. 048443, дв. 831968, 1985 года выпуска, 4 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1985 | 133 072 | 17 000 000 | 1 700 000 |
| 143 | Автошасси Урал-4320, ш. 046100, дв. 818565, 1985 года выпуска, 4 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1985 | 133 009 | 17 000 000 | 1 700 000 |
| 144 | Автошасси КамАЗ-4310, ш. 0033499, дв. 0110754, 1987 года выпуска, 4 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1987 | 133 102 | 18 000 000 | 1 800 000 |
| 145 | Грузовой КамАЗ-4310, ш. 0029435, дв. 0056962, 1986 года выпуска, 3 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1986 | 99 525 | 22 000 000 | 2 200 000 |
| 146 | Автошасси КрАЗ-255Б, ш. 249691, дв. 378, 1975 года выпуска, 4 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1975 | 95 885 | 14 000 000 | 1 400 000 |
| 147 | Автошасси КрАЗ-255Б, ш. 293846, дв. 457887, 1977 года выпуска, 4 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1977 | 94 531 | 14 000 000 | 1 400 000 |
| 148 | Автошасси КрАЗ-255Б, ш. 293554, дв. 455472, 1977 года выпуска, 4 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1977 | 95 009 | 14 000 000 | 1 400 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, **в 11.00, 14 октября 2011 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 11 октября 2011 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **14 октября 2011 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

25 жніўня 2011 г.
№ 25 (263)


БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# СУСЕДЗІ СВАРАЦЦА, А ВІНАВАЦЯЦЬ ДЗЯРЖАВУ

**Зямля і жыллё — гэтыя дзве тэмы сталі лейтматывам асабістага прыёму грамадзян старшынёй Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Барысам БАТУРАМ у Салігорску.**

## Саламонава рашэнне

Нездарма гавораць, што працей любіць усё чалавецтва, чым свайго суседа. Многіх спрэчак, у якіх давялося разбірацца кіраўніку аблвыканкама, можна было б пазбегнуць, калі б людзі не квапіліся на чужое, не псавалі б сабе і суседу нервы з-за метра спрэчнай мяжы зямельнага ўчастка. На жаль, для некаторых грамадзян прынцып «жыві годна і дай жыць іншым» не з'яўляецца ўзорам паводзін.

Выпадак з жыцця: двое суседзяў не могуць вызначыцца з мяжой паміж участкамі. Спрэчкі цягнуцца не год і не два, і канца цяжбе не бачна. Каб паставіць, нарэшце, кропку ў гэтым пытанні, Барыс Батура даручыў старшыні Салігорскага райвыканкама на працягу двух тыдняў узвесці за бюджэтныя сродкі на мяжы ўчасткаў агароджу — у адпаведнасці з існуючай дакументацыяй.

— Забетаніруйце, — удакладніў Батура, маючы на ўвазе надзейнасць будучага «памежжа». — Будуць перашкаджаць — задзейнічайце міліцыю. А калі адзін ці другі сусед агароджу пашкодзіць — спагнаць штраф... З зямельнымі спрэчкамі заўсёды так: суседзі паміж сабой сварацца, а вінавацяць дзяржаву.

У гарадскім пасёлку Старобін суседзі пяты год дзеляць зямлю. Бацьку скаржніцы, якая прыйшла на прыём, яшчэ ў 30-х гадах мінулага стагоддзя далі ля дома 12 сотак. Аднак сусед паступова захопліваў гэту тэрыторыю, у выніку чаго ўчастак скаржніцы скараціўся да 7,5 соткі, затое ў суседа вырас да 20. Некалькі гадоў таму сусед вырашыў аформіць дзяржаўны акт на зямлю, пры гэтым прыхапіўшы яшчэ 0,5 метра. Скаржніца звярнулася ў суд, які адмяніў дзяржакт і ўсе рашэнні, з ім звязаныя. Але суд не вызначыў межаў, бо пасялковы выканкам не прадставіў адпаведных дакументаў, якія пацвярджалі б першапачатковыя межы ўчасткаў. Па факце ў суседа да гэтага часу застаецца ў карыстанні 20 сотак, а ў скаржніцы — 7,5. У дадатак на прыхопленай тэрыторыі ўзведзены пабудовы, зносіць ці пераносіць якія сусед не збіраецца... Мясцовыя ўлады прапаноўвалі ў якасці выйсця размежаваць участкі не па прамой, а абмінаючы старыя пабудовы. Скаржніцу гэта задаволіла б, але супраць — «захопнік». Жанчына просіць аддаць ёй хоць колькі зямлі, але саступаць апанент не збіраецца і сам падае заяву ў суд.

З улікам складанасці пытання, Барыс Батура даручыў начальніку Мінскай абласной землеўпарадкавальнай службы асабіста выехаць на месца і разабрацца ў сітуацыі.

Яшчэ адной жыхарцы Старобіна таксама не пашанцавала з суседзямі. У двары свайго прыватнага дома маладая жанчына трымае трох пародзістых сабак, рэгулярна вывозіць іх на спецыялізаваныя выставы. Сабакі, па словах гаспадыні, выхаваныя, не выюць, не брэшуць. А суседка ўжо тры гады шле лісты ва ўсе інстанцыі: маўляў, сабакі жыцця не даюць. Начальнік РАУС, які прысутнічаў на прыёме, пацвердзіў неабгрунтаванасць скаргаў, што неаднойчы было ўстаноўлена падчас правядзення праверак усімі профільнымі службамі. Парушэнняў заканадаўства з боку гаспадыні сабак няма. Міліцыянеры нават па агароджы грукалі, каб прымусіць сабак забрахаць, але тыя даказалі сваю выхаванасць і голас ні разу не падалі. Уся праблема ў тым, што няўрымслівая суседка працягвае дасылаць скаргі ва ўсе інстанцыі, а тыя вымушаны зноў і зноў паўтараць праверкі, каб адрэагаваць на чарговы «сігнал».

— Калі ўсё, што вы гаворыце, — праўда, тады перастаньце туды хадзіць, — звярнуўся старшыня Мінаблвыканкама да работніка міліцыі, — а калі суседка будзе працягваць скардзіцца, — накіроўвайце яе лісты мне.



Фота БЕЛТА.

## Рамонтныя страсці

Шматдзетная маці, якая без мужа выхоўвае дзіця-інваліда, пражывае ў старым доме і прыйшла на прыём прасіць палепшыць яе жыллёвыя ўмовы.

— Вы скардзіцеся, што дом у вас стары. Вы такім яго і атрымалі? — пацікавіўся Барыс Батура. — Не? Для таго, каб дом заставаўся ў нармальным стане, яго трэба даглядаць, а ён свой проста запусціці, — дадаў ён, разглядаючы фотаздымкі хаты. — Жанчына, калі пастарэецца, заўсёды мае стварыць утульную абстаноўку ў доме. Хай там будзе бедна, затое чыста і акуратна.

Калі ж высветлілася, што старэйшаму сыну (не інваліду) ужо споўніўся 21 год, што ён жыве і працуе ў сталіцы, старшыня абласнога выканкама падвёў пад размовай рысу:

— Рукі ёсць у хлопца, ногі ёсць, хай прыязджае і дапамагае. Мы са свайго боку можам толькі аказаць вам матэрыяльную падтрымку на правядзенне рамонту. Дом мяняць мы не будзем. У вас — прыватная маёмасць і ёсць працаздольныя дзеці. Да свайго жылля трэба ставіцца належным чынам.

З падобным пытаннем да Барыса Батуры звярнулася і сям'я пенсіянераў са Слуцка. Дом яны некалі атрымалі ад Слуцкага льнозавода, дзе жонка адпрацавала 38 гадоў. Пабудаваны ў 1960 годзе, будынак за ўвесь час не меў ніводнага капрамонту. Сёння ён непрыдатны для пражывання. Жыльцы просяць зрабіць праектную дакументацыю і правесці капітальны рамонт.

Як патлумачыў намеснік старшыні Слуцкага райвыканкама, сям'і скаржнікаў раён прадастаўляе ў Слуцку падменнае жыллё на час правядзення капрамонту іх дома, але самі жыльцы пераязджаць туды адмаўляюцца. Пенсіянеры пацвердзілі гэты факт і абгрунтавалі сваю пазіцыю нежаданнем раённых улад рабіць праект дома. «А без праекта яны добры рамонт усё роўна не зробяць!» — пераканаы людзі.

— Гэта ваш уласны дом? — спытаў Батура. — Не? Значыць, дзяржаўны. Вам прапануюць перасяліцца ў жыллё падменнага фонду, і тады мы зробім вам рамонт. А вы — не жадаеце. Патрабуеце паказаць дакументацыю, хоць не з'яўляецеся гаспадарамі і грошы за рамонт плаціць не будзеце. Такім чынам, калі на працягу тыдня вы не перасяліцеся, да пачатку ацяпляльнага сезона вам зробяць рамонт, аднак калі сарвеце пераезд — да рамонту ніхто не прыступіць.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС»)*

АДКРЫТЫ ФОРУМ

# Спадзяёмся на свядомасць гаспадароў

**На працягу некалькіх апошніх гадоў кожнае лета абвастраецца праблема вяртання малака, якое закупляецца ў насельніцтва, з-за выяўлення ў ім інгібіруючых рэчываў (антыбіётыкаў). Самая распаўсюджаная прычына іх з'яўлення — лекі, якімі гаспадары лячылі сваіх кароў. Ці змянілася што-небудзь сёлета? Ці стала вяртанняў менш?**

**Старшыня Бартнікоўскага сельскага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна Яўген ЧЭРКАС:**

— На тэрыторыі сельсавета 25 населеных пунктаў. Закупам малака ахоплены ўсе. Функцыі збору тэрытарыяльна падзелены паміж сельвыканкамам і СВК «Гігант» (адзіным у раёне калгасам, які не перадаў гэтыя функцыі іншым). У штаце СВК «Гігант» — тры малаказборшчыкі і лабарант. Пры сельвыканкаме — 4 малаказборшчыкі і 2 лабаранты. У летні час па ўсім сельсавеце закупляецца прыблізна 3,5—4 тоны малака ў дзень. Разлікі з насельніцтвам праводзяцца двойчы на месяц.

З пачатку года ў нас былі два вяртанні невялікіх партый малака, але ў цэлым на дадзены момант праблема вяртанняў з-за выяўлення антыбіётыкаў у малацэ знятая. Усё насельніцтва папярэджана: калі выявім антыбіётык, увогуле не будзем браць малако ў такога гаспадара. Трэба ж разумець, што з-за аднаго несумленнага чалавека вяртаецца ўся партыя, церпяць многія малаказдатчыкі. Малако, сабранае сельвыканкамам, правяраецца на шчыльнасць, тлустасць, працэнт наяўнасці вады. На антыбіётыкі яно правяраецца толькі на малаказаводзе. У СВК «Гігант» таксама ёсць магчымасць рабіць аналіз на антыбіётыкі. У цэлым, больш магчымасцяў для праверак не стала, проста людзі цяпер больш свядома падыходзяць да гэтага.

Агульная колькасць кароў увесь час скарачаецца: калі ў 2010 годзе іх было 404, то цяпер — 351. Пры гэтым растуць надоі малака на карову. Гэта добра і для нас, і для нашага насельніцтва, бо гэта ж — дадатковая капейка ў сямейны бюджэт. Радуе, што крыху павышаюцца закупачныя цэны на малако — за лета ўжо тройчы павышаліся. Хаця, на мой погляд, закуп малака — гэта не функцыя сельскага Савета, але калі трэба закупаць малако — будзем закупаць.

**Старшыня Каменскага сельскага Савета дэпутатаў Лепельскага раёна Мікалай СІНІЦЫН:**

— На нашай тэрыторыі закуп малака праводзіцца ў 18 населеных пунктах з 31. Гэтая работа ўскладзена на камунальнае ўнітарнае прадпрыемства (КУП «Камень-Аграсэрвіс»), якое працуе ўжо сёмы год.

Сёлета вяртанняў малака з-за наяўнасці антыбіётыкаў у нас не было. Мы на гэтую «хваробу» адхварэлі яшчэ гады чатыры таму: калі Лепельскі малочнакансервавы камбінат пачаў адпраўляць сваю прадукцыю на экспарт, ён павысіў патрабаванні да якасці сыравіны. Тады вяртанні малака ў нас здараліся літаральна кожны месяц. Мы тлумачылі людзям, колькі пасля лячэння каровы трэба пачакаць, перш чым зноў пачаць здаваць малако. Давялося «вылічваць» канкрэтных гаспадароў, якія безадказна ставіліся да гэтага. Правесці такі аналіз — дарага, але прыйшлося на гэта ісці. І паступова людзі сталі больш адказнымі.

У людзей часта ўзнікае пытанне з тлустасцю малака, але тут усё залежыць ад таго, як яе вызначаць на малаказаводзе. Нагадаю, што базісную тлустасць у краіне ўзнялі, але ж нашы каровы за гэты час у еўрапейскіх не ператварыліся. У выніку людзі страцілі ў грошах. Сёння трымаць у гаспадарцы адну карову стратна. Кошт літра малака сёння нізкі. Калі б гэта было выгадна, людзі трымалі б больш кароў...

**Старшыня Ціхініцкага сельскага Савета дэпутатаў Рагачоўскага раёна Галіна СЕРАБРО:**

— У нас 6 населеных пунктаў, але малако збіраецца толькі ў двух (у астатніх кароў ужо не трымаюць). Закупам займаецца мясцовае сельгаспрадпрыемства. Ведаю, што ў некаторых сельсаветах гэта робяць індывідуальныя прадпрымальнікі, але наша гаспадарка адмовілася ад іх паслуг.

Вяртанняў сёлета было два — па асобных малаказборшчыках. Іх усяго трое, і кожны правярае сваю партыю сабранага малака асобна. На малочнатаварнай ферме, дзе малако зліваецца ў халадзільнікі, малаказборшчыкі кожны дзень робяць адбор проб з кожнай прывезенай флягі, правяраюць на шчыльнасць, тлустасць, працэнт наяўнасці бялку і вады, а таксама на антыбіётыкі. Бывае, што нашы жыхары не пагаджаюцца з вызначэннем тлустасці малака, тады мы выязджаем, робім кантрольны аналіз. Правяраем па некалькі разоў. Справа ў тым, што карова — жывы арганізм. Яна рэагуе на розныя змены, адпаведна вагаецца і працэнт тлустасці малака.

Зменшылася ў нас пагалоўе кароў. Старыя ўжо не могуць даглядаць жывёлу, а ў моладзі вельмі сур'ёзная загружанасць на працы: напрыклад, жывёлаводы працуюць на ферме па 12-13 гадзін, таму сіл яшчэ і на сваю прысядзібную гаспадарку проста не застаецца.

**Старшыня Карцэвіцкага сельскага Савета дэпутатаў Нясвіжскага раёна Анатоль ЖУРАЎСКІ:**

— Я другі год на гэтай пасадзе, пры мне пытанняў па арганізацыі закупу малака не ўзнікала, скаргаў ад насельніцтва не паступала. Закупам малака ў нас займаецца сельвыканкам. На тэрыторыі сельсавета 6 населеных пунктаў, малако збіраецца ва ўсіх, ад 56 кароў.

Сёлета вяртанняў малака з-за выяўлення ў ім антыбіётыкаў не было: у нас арганізаваны нармальны кантроль за зборам. Калі ёсць падазрэнне, што карова хворая, бяром пробу і правяраем яе асобна. На закупе задзейнічаны два малаказборшчыкі і адзін лабарант. Усё малако адвозіцца на малочнатаварную ферму, дзе праводзяцца аналізы, а адтуль яно адпраўляецца на перапрацоўку.

Нягледзячы на скарачэнне пагалоўя, у нас павялічваюцца надоі на карову: сёлета па кожнай даём «плюс» 212 кілаграмаў у параўнанні з папярэднім годам. Людзі самі ў гэтым зацікаўлены — гэта іх грошы. Да таго ж, малаказдатчыкі перасталі разбаўляць малако вадой. І ў многім гэта вынік нашай працы з насельніцтвам. Мы пачыналі з таго, што час ад часу — непланава, нечакана — разам з лабарантамі выбарачна бралі пробы малака ад асобных кароў непасрэдна ў час здачы. Летась былі выпадкі, калі мы выяўлялі тлустасць 3,0 ці нават 2,8. Цяпер такога няма. Мера аказалася эфектыўнай, бо людзі не ведаюць, калі мы прыедзем і чыё канкрэтна малако праверым.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС»)*

# ТОНЫ «ЛІХІХ» РАСЛІН ЗНІШЧЫЛІ

**У Віцебскай вобласці падчас правядзення аперацыі «Мак» супрацоўнікі органаў унутраных спраў толькі ў ліпені выявілі каля 340 фактаў незаконных пасеваў канопляў і маку на плошчы амаль што 5 тысяч квадратных метраў. Знішчана больш як 4 тоны раслін, якія ўжываюцца пры вырабе наркотыкаў. Заканадаўствам за пасеў або вырошчванне нават без мэты збыту раслін, што змяшчаюць наркатычныя рэчывы, прадугледжаны штрафныя санкцыі — да 20 базавых велічынь.**

У вобласці на ўліку ў органах аховы здароўя знаходзіцца больш за 1,2 тысячы чалавек. Насамрэч колькасць тых, хто ўжывае наркотыкі, нашмат большая. Як канстатуюць нарколагі, у апошні час у моладзі ўсё больш «папулярнымі» становяцца небяспечныя псіхатропныя рэчывы — амфетамін і экстазі, бо з імі «весялей» на дыскатэках і ў начных клубах, а таксама розныя сумесі для курэння з псіхатропнымі рэчывамі.

Каб «падрабіць на наркотыках», іх перавозкай рызыкуюць займацца людзі, вельмі далёкія ад крымінальнага свету. У прыватнасці, да 8 гадоў пазбаўлення волі ў судзе прыгаварылі санітарку, якая працавала ў адной з віцебскіх устаноў аховы здароўя. Яна, пажылая жанчына, стала кур'ерам: перавозіла з суседняй краіны каля 200 грамаў гераіну. У сярэдзіне ліпеня на віцебскім чыгуначным вакзале затрымалі 33-гадовую супрацоўніцу прыватнай фірмы, пры якой было 190 грамаў гераіну, а гэта — аж 500 доз. Кошт канфіскаванага зелля на «чорным рынку» — каля 100 мільёнаў рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

# ПІЦЬ ЦІ НЕ ПІЦЬ?

*Жыхары пасёлка Міханавічы зачакаліся чыстай вады*

**— Колькі можна піць брудную ваду? Нашы бацькі яе пілі, мы п'ём, дзеці нашы п'юць, — абураецца па тэлефоне жыхарка Міханавіцкага сельсавета Мінскага раёна Вольга Андрэеўна Тарасюк. — Прыязджайце і самі паглядзіце, што цячэ з нашых кранаў: вада рудая, пах яшчэ той... Усе навокал ведаюць, што ўзровень жалеза ў ёй перавышае норму, а гэта шкодзіць здароўю. Людзі неаднаразова скардзіліся на якасць вады ў сельвыканкам, але аднаму сельвыканкаму з такой праблемай не справіцца!..**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

...Першае, што я зрабіла, пераступіўшы парог адміністрацыйнага будынка Міханавіцкага сельскага Савета, — папрасіла адкрыць кран з вадой у адным з дапаможных памяшканняў. Вада аказалася ні бруднай, ні рудой — звычайнай, праўда, мела крыху спецыфічны пах.

— А вы і не ўбачыце «жалеза» няўзброеным вокам, — тлумачыць **старшыня Міханавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Святлана ДАВАЛЬЦОВА.** — Яго наяўнасць у вадзе могуць вызначыць толькі санстанцыя або водна-каналізацыйная служба раёна, узяўшы спецыяльныя пробы на аналіз.

Вынікі гэтых аналізаў несуцяшальныя: у свідравінах, якія падсілкоўваюць вадой пасёлак Міханавічы, узровень жалеза даходзіць да 4,5 міліграма на кубічны дэцыметр пры норме 0,3 міліграма. Інакш кажучы, бяспечны ўзровень перавышаны ў шмат разоў. Такая сумная спецыфіка амаль усяго Мінскага раёна.

Каб зменшыць наступствы гэтай «спецыфікі» для людзей, яшчэ у 1990-х у пасёлку Міханавічы пабудавалі станцыю абезжалезвання — аб'ект з прапускной магутнасцю 50 кубаметраў вады ў гадзіну (на той час гэтага аб'ёму хапала, бо перспектыва забудовы новага жылога мікрараёна яшчэ не маячыла на даляглядзе). Аб'ект увайшоў у склад Міханавіцкай станцыі другога пад'ёму вады і нейкі час збольшага спраўляўся з задачай па ачыстцы... Аднак і пасёлак не стаяў на месцы — ён рос і будаваўся... Міханавіцкі сельвыканкам адным з першых арганізаваў на тэрыторыі Мінскага раёна адразу некалькі жыллёва-будаўнічых кааператываў. Паступова колькасць насельніцтва ў Міханавічах перасягнула 5 тысяч чалавек, і магутнасцяў невялікай станцыі абезжалезвання стала відавочна недастаткова.

— Пасёлак Міханавічы забудоўваецца і пашыраецца вельмі актыўна, сёння паляпшаюць жыллёвыя ўмовы ўжо тыя, хто стаіць у нас у чарзе з 2008—2009 гадоў, — гаворыць Святлана Уладзіміраўна. — Толькі за апошнія два гады тут з'явілася 5 шматпавярховых дамоў, распачата будаўніцтва 6-га. Але, вырашыўшы кватэрнае пытанне, людзі сутыкаюцца з чарговай праблемай: дрэннай якасцю пітной вады.

Тэма для Давальцовай не новая — штогод грамадзяне закідваюць розныя інстанцыі скаргамі на «тое, што цячэ з крана», нават не называючы гэта вадой. Прыкладна трэцяя частка зваротаў так ці інакш датычыцца «воднай» тэматыкі: ваду з павышанай колькасцю жалеза вымушаны ўжываць і дарослыя, і дзеці, таму што звычайныя бытавыя фільтры супраць яго бяссільныя.

Летам пасёлак спажывае 120 «кубоў» вады за гадзіну, а станцыя за тую ж гадзіну здольна абезжалезіць і адправіць у рэзервуар для захоўвання толькі 50 «кубоў». Адкуль бяруцца яшчэ 70? Яны адпраўляюцца ў рэзервуар... прама са свідравіны. Такім чынам ачышчаны і неачышчаны патокі змешваюцца, і ў выніку жыхары пасёлка атрымліваюць нешта сярэдняе: вадаправодную ваду, якая ўжо не настолькі перанасычаная жалезам, як прыродная, але ўсё ж далёкая ад нормы.

— Часам, калі выдавалася дажджлівае лета, узровень жалеза ў свідравінах паднімаўся да 6,5 міліграма, але дзякуючы станцыі ачысткі ў вадаправодную сістэму трапляла «ўсяго» 1,5 міліграма, што ўсё роўна больш за норму, — кажа **намеснік дырэктара ЖКГ па воднай гаспадарцы Мінскага раёна Дзмітрый ДРОЗД.** — У пасёлку Міханавічы вада ў свідравінах горшая, чым у многіх іншых населеных пунктах раёна, дзе яна таксама далёкая ад нормы...

Атрымліваецца, што будаўніцтва новай, больш магутнай станцыі абезжалезвання — для пасёлка не раскоша, а неабходнасць. Аб'ект павінен быць разлічаны на перапрацоўку 120 кубаметраў вады ў гадзіну, не менш. Усе абавязкі па падрыхтоўцы праектнай дакументацыі ўзяло на сябе ААТ «Белтрансгаз», якое ў свой час будавала і першую станцыю абезжалезвання ў Міханавічах. Меркавалася, што новая станцыя будзе ўзведзена побач з ёю, практычна на адной пляцоўцы.

— Але з-за аб'ектыўна-суб'ектыўных прычын распрацоўка праекта зацягнулася ажно на два гады, — канстатуе Святлана Давальцова. — Увесь гэты час ішла перапіска «Белтрансгаза» з інстанцыямі Мінскага раёна, у прыватнасці, з ЖКГ — цяперашнім балансаўтрымальнікам Міханавіцкай станцыі. Але, нарэшце, святло ў канцы тунэля замільгала: «Белтрансгаз» паабяцаў завяршыць распрацоўку праекта ўжо ў верасні.

Старшыня і дэпутацкі корпус Міханавіцкага сельскага Савета разглядаюць гэту падзею як знакавую для жыхароў пасёлка. Калі праект будзе зацверджаны ўсімі неабходнымі інстанцыямі, з'явіцца рэальная гарантыя таго, што ўжо сёлета ён трапіць у графік Мінскага райвыканкама па будаўніцтве (і адпаведна, фінансаванні) аб'ектаў інжынернай інфраструктуры.

— У канцы года гэты графік будзе карэктавацца, туды могуць уключыць новыя аб'екты, у тым ліку і наш. Вось чаму мы так спяшаемся, літаральна стаім на вушах і не даём спакою «Белтрансгазу», — хвалюецца Святлана Уладзіміраўна. — Праблема пітной вады — адна з найвастрэйшых у сельсавеце. Вырашым яе — скароціцца колькасць скаргаў, зменіцца настрой у грамадзян, адыдзе трывога за здароўе дзяцей.

— Ці могуць жыхары Міханавіцкага сельсавета разлічваць сёлета на пачатак будаўніцтва новай станцыі абезжалезвання? — пацікавілася ў **дырэктара прадпрыемтва «УКБ-Будінвест» Ігара МАЦУРЫ.**

— Цяпер няма пра што гаварыць. Гэта высветліцца, калі да нас трапіць гатовы праект, — сказаў Ігар Сцяпанавіч. — Усё будзе залежаць, па-першае, ад аб'ёму фінансавання, па-другое, ад складанасці канструкцый, закладзеных у праекце, па-трэцяе, ад тэрміну пошуку падраднай арганізацыі і г.д. Ды і цяжка цяпер сказаць, як пад канец года будуць расстаўлены прыярытэты, ці палічаць гэты аб'ект першачарговым на ўзроўні вобласці — бо менавіта за аблвыканкамам застанецца апошняе слова. На мой асабісты погляд, новая станцыя абезжалезвання ў пасёлку Міханавічы — аб'ект неабходны, таму што вада там відавочна дрэнная. І пакуль што я не бачу сур'ёзных перашкод для будаўніцтва, за выключэннем магчымых праблем з фінансаваннем.

На якой ступені гатоўнасці знаходзіцца сёння праект новай станцыі абезжалезвання? З гэтым пытаннем я звярнулася да **начальніка ўпраўлення капітальнага будаўніцтва ААТ «Белтрансгаз» Васіля ВАЎРЫШЧУКА.**

— Праектныя работы яшчэ вядуцца, — патлумачыў ён. — Але пакуль што нас тармозіць раённая жыллёва-камунальная служба — уладальнік Міханавіцкай станцыі абезжалезвання і станцыі другога пад'ёму вады. Мы зрабілі ім два запыты наконт электразабеспячэння гэтых аб'ектаў: там павінны быць у наяўнасці кабельныя лініі, дызель-генератар, рэзервавы запас паліва і г.д. Але пакуль што ніякага адказу ад жылкамгаса не паступала... Тым не менш, спадзяёмся, што распрацоўку праекта ўдасца завяршыць у верасні, пасля гэтага мы павінны аддаць яго на экспертызу. Пасля экспертызы ўся дакументацыя перадаецца ва ўпраўленне капітальнага будаўніцтва Мінскага райвыканкама, якое і будзе вызначаць: калі і ў якой чарговасці ўзводзіць аб'ект.

***...Так што адказ на пытанне — быць ці не быць новай станцыі абезжалезвання пітной вады — жыхары Міханавіцкага сельсавета атрымаюць літаральна праз пару месяцаў. Заўважу, што ў выпадку станоўчага адказу чыстую ваду яны пачнуць спажываць ужо вясной. У любым выпадку, у канцы года мы вернемся да гэтай тэмы.***

**Наталля КАРПЕНКА.**

*Мінскі раён.*


Паритетбанк

**Открытое акционерное общество «Паритетбанк», расположенное по адресу: 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а, СООБЩАЕТ, что 12 сентября 2011 года**
***в соответствии с решением Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк»***
**ПРОВОДИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. О процедурных вопросах.
2. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Собрание проводится по адресу:
г. Минск, ул. Киселёва, 61а, комн. 205.

Бюллетени для заочного голосования и другие материалы к собранию участники собрания могут получить по указанному адресу с 1 по 2 сентября 2011 года с 9.00 до 13.00 по месту проведения Общего собрания акционеров.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть возвращены не позднее 7 сентября 2011 года по месту их выдачи, дата подсчета голосов – 9 сентября 2011 года.

**Телефон для справок: 288 64 74.**

***Наблюдательный Совет ОАО «Паритетбанк».***

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27.10.2006 г. № 5. УНП 100233809.

**www.Paritetbank.by**

**КУП: НЮАНСЫ СТАНАЎЛЕННЯ**

# «ПАЦЫЕНТ» ХУТЧЭЙ ЖЫВЫ...

**Год таму размаўляла са старшынёй аднаго сельскага Савета. Ён быў толькі нядаўна абраны, планаў — безліч, гэтымі самымі планамі і дзяліўся. Расказаў між іншым, што збіраецца стварыць пры сельвыканкаме невялікае камунальнае прадпрыемства для аказання насельніцтву розных сельскагаспадарчых і іншых паслуг — каб і людзям добра было, і сельвыканкам ад праблем па добраўпарадкаванні разгрузіць... Патэлефанавала яму нядаўна, каб даведацца, як увасабляюцца планы ў жыццё. «Ніяк, — адказвае. — На голым месцы КУП *(камунальнае ўнітарнае прадпрыемства — Н. К.)* не створыш. Патрэбна тэхніка, грашовыя сродкі. А дзе ўзяць? І як потым выйсці на прыбытак, не павышаючы цэны на свае паслугі?»**

Праблема не новая. Сутыкнуўшыся з ёю, пасавалі многія старшыні пярвічнага звяна ўлады, не толькі навічкі, але і вопытныя кіраўнікі. Далёка не ва ўсіх хапала цярпення і сіл, узяўшыся за справу, давесці яе да завяршэння. Атрымлівалася гэта, бадай што, у адзінак. Як, напрыклад, у **старшыні Цімкавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Капыльскага раёна Алены ОСТРЫКАВАЙ.**

— Ідэя стварэння свайго камунальнага прадпрыемства ўзнікла ў нас не на голым месцы, — кажа яна. — Для гэтага былі прычыны. Цімкавіцкі сельсавет асаблівы, на яго тэрыторыі знаходзіцца шмат арганізацый, якія не маюць дачынення да сельскагаспадарчай вытворчасці. Адпаведна, вялікая колькасць нашых жыхароў у гэтых арганізацыях працуе. Доля ж занятых у сельгасвытворчасці значна меншая. Таму, калі ў людзей узнікала патрэба ў апрацоўцы прысядзібных участкаў, адразу паўставала пытанне. Мясцовае сельгаспрадпрыемства дапамагала толькі сваім работнікам і сваім пенсіянерам. Астатнія, незадаволеныя гэтым, звярталіся ў сельскі Савет са скаргамі...

У 2001-м, калі я прыйшла сюды на працу, на балансе сельвыканкама з тэхнікі знаходзіўся толькі няспраўны трактар, спісаны сельгаспрадпрыемствам. На яго, так бы мовіць, мы і зрабілі «стаўку». Дапамагло і тое, што сельвыканкам займаўся закупкай малака ў насельніцтва — у нас з'явілася крыху «малочных» грошай, якія вырашылі патраціць на набыццё ротарнай касілкі. Паралельна адрамантавалі трактар, пасля чаго ўжо можна было не толькі тэрыторыю сельсавета абкошваць, але і людзям дапамагаць.

**— Але на гэтым шмат не заробіш...**

— Безумоўна. Таму пачалі шукаць спонсараў для аказання нам дапамогі. І, уявіце сабе, знайшлі. Арганізацыя абласнога падпарадкавання адгукнулася на нашу просьбу і выдзеліла 5 мільёнаў рублёў, на той час вялікія грошы. Мы ўжо ведалі, як іх патраціць — купілі бульбакапалку.

**— І стварылі камунальнае прадпрыемства?**

— Не, спачатку гэта было так званае механізаванае звяно. У ім працаваў усяго 1 трактарыст, а бухгалтэрыю вялі штатныя работнікі сельвыканкама. З трактарыстам, шчыра скажу, пашанцавала. Сяргей Кавальчук аказаўся гэткім мясцовым Кулібіным: знайшоў на звалцы і аднавіў лапату для чысткі вуліц ад снегу, давёў да ладу спісаныя плугі, змайстраваў спецыяльныя ланцугі для збівання бульбянога бацвіння... Звяно праіснавала некалькі гадоў, да 2006-га, і ўвесь гэты час пакрысе развівалася, пашыралася кола яго паслуг. І толькі ў канцы 2006 года яно ператварылася ў камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Цімкаўлянка» — афіцыйна зарэгістраваную юрыдычную асобу, якая мае свой статут.

**— Ад перамены формы нешта змянілася? Стала лепш ці горш?**

— Цяпер мы мелі самастойную адзінку — сваё прадпрыемства, і маглі браць людзей у штат (раней дазвалялася толькі афармляць з чалавекам дагавор на той ці іншы час). З іншага боку, паколькі КУП аказвае сезонныя паслугі, у зімовы час працы як такой у яго не было, а заработную плату і падаткі выплачваць прыходзілася. Гэта прымусіла нас шукаць іншыя віды паслуг — тыя, якія будуць запатрабаваныя зімой або круглы год. Заняліся, напрыклад, расчысткай вуліц ад снегу, пачалі прадастаўляць паслугі па адпампоўванні каналізацыі... Але самым удалым стаў 2007 год, калі, у адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай па падтрымцы ўласных падсобных гаспадарак, аблвыканкам выдзеліў фінансавыя сродкі для развіцця нашага камунальнага прадпрыемства. За іх мы купілі новы трактар, новыя бульбакапалку і бульбасаджалку, ротарную касілку і прэс, набылі воз для збору смецця і перавозкі буйнагабарытных прадметаў... Карацей кажучы, маглі аказваць ужо 13 відаў паслуг.

**— Значыць, зборам смецця на тэрыторыі Цімкавіцкага сельсавета таксама займаецца ваш КУП?**

— Менавіта ён заключае дагаворы з насельніцтвам і па пэўным графіку вывозіць з вёсак смецце. Раённая жыллёва-камунальная гаспадарка даўно не мае да гэтага дачынення.

**— А які штатны расклад у вашага КУПа?**

— Дырэктар (ён жа і трактарыст), на палову стаўкі — бухгалтар і на палову стаўкі — касір (ён жа дыспетчар). Рэальна паслугі аказвае адзін чалавек, а двое лічаць грошы і працуюць з насельніцтвам. Мы не можам дазволіць сабе раскошу трымаць асобна дырэктара, бо гэта цягне за сабой выплату і асобнай зарплаты. КУП наш не прыбытковы — зарабляем прыкладна столькі ж, колькі расходуем. Даводзіцца на многім эканоміць, у выніку дадатковая нагрузка кладзецца на мяне як на старшыню сельвыканкама. Купіць паліва, дастаць запчасткі, дамовіцца з рамонтам тэхнікі — гэта ўсё мае праблемы. Але разлічваць я павінна толькі на тыя грошы, якія зарабіў КУП — дадатковых узяць няма адкуль, ніякіх датацый нам не даюць. Таму і летась, і сёлета даводзілася заключаць дагаворы з сельгаспрадпрыемствамі, аказваць ім платныя паслугі: прэсаваць салому, капаць бульбу... Каб крыху зарабіць і перажыць зіму, наш КУП заключыў дагавор з раённым жылкамгасам на чыстку дарог ад снегу. КУП чысціў, а жылкамгас нам за гэта плаціў, паколькі дарогі ў аграгарадках знаходзяцца на яго балансе. Так і выжываем.

**— Але калі прадпрыемства нерэнтабельнае, ці ёсць у ім сэнс?**

— Яно ж і не стратнае! На зарплату і рамонт тэхнікі нам хапае. Да таго ж, КУП ствараўся ў першую чаргу для дапамогі насельніцтву, асабліва яго неабароненай часткі, і з гэтай задачай ён спраўляецца. Безумоўна, добра было б і дапамогу людзям аказваць, і прыбытак мець, але так не атрымліваецца. Мы не можам «задзіраць» цэны на паслугі — наадварот, імкнёмся трымаць іх на парадак ніжэй, чым у прыватнікаў, якія таксама маюць ва ўласнасці тэхніку. Скажам, апрацоўка «соткі» на прысядзібным участку каштуе ў нас прыкладна 3 тысячы рублёў. Акрамя гэтага, існуе сістэма адтэрміноўкі: калі ў чалавека сёння няма грошай, каб разлічыцца за паслугу КУПа, ён можа зрабіць гэта праз адзін-два тыдні, пасля атрымання пенсіі. І людзям гэта падабаецца. За год мы аказваем дзесьці 1,5 тысячы паслуг. Зрэдку дапамагаем і суседнім сельсаветам. Але, каб рабіць гэта часцей, неабходны іншыя магутнасці, а нам дай Бог са сваімі праблемамі справіцца.

**— А што перашкаджае вашым суседзям стварыць свае прадпрыемствы ці нейкія іншыя структуры па аказанні сельскагаспадарчых і камунальных паслуг насельніцтву?**

— Гэта ў любым выпадку каласальная дадатковая нагрузка для старшыні сельскага Савета, дадатковая адказнасць, на што не кожны сёння адважыцца. Я ў свой час паспрабавала, прайшла цераз усе «нюансы станаўлення», і цяпер ужо сваёй працы без КУПа не ўяўляю — настолькі патрэбнай аказалася гэта справа. Пераважную большасць пытанняў насельніцтва, мясцовых праблем можна вырашыць тут жа, сваімі сіламі, не чакаючы дапамогі з раёна ці вобласці.

Вось вы пыталіся, ці можа КУП стаць рэнтабельным... Калі ён будзе мець сельскагаспадарчую накіраванасць, дык наўрад ці. Для таго, каб ён цвёрда стаяў на нагах, неабходна аснова, падмурак, матэрыяльная база, і тут без дапамогі дзяржавы, без датацый абысціся вельмі складана. І такая падтрымка павінна быць, калі сур'ёзна ставіцца да працы КУПаў, да іх формы і зместу. Бо менавіта КУПы сёння могуць істотна «разгрузіць» раённы жылкамгас.

Але пакуль што яны існуюць як бы самі па сабе: ёсць у наяўнасці, чымсьці займаюцца, неяк выжываюць — ну і добра...

**— Алена Мечыславаўна, а параілі б вы сваім калегам займацца стварэннем КУПаў?**

— Калі кіраўнік мясцовай улады сапраўды хоча вырашаць пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва, за гэту справу, безумоўна, можна ўзяцца. Але папярэдне трэба вельмі сур'ёзна і ўважліва ўсё абдумаць, прадумаць і падлічыць, апытаць насельніцтва — што ім трэба? Ды і не абавязкова ствараць КУП па аказанні сельскагаспадарчых паслуг пры сельвыканкаме. КУПы могуць цудоўна існаваць пры тых жа дамах быту, пры раённых ЖКГ, пры сельгаспрадпрыемствах... Але ствараць іх трэба. І калі б асабіста мне яшчэ раз прыйшлося пачынаць усё спачатку — я, напэўна, рызыкнула б зноў. Таму што, калі глядзіш на старэнькіх адзінокіх бабулек, на пенсіянераў, якія самі нічога не могуць, дык з дзвюх праблем выбіраеш меншую. Пра сябе ўжо не надта думаеш — хочацца людзям дапамагчы.

**Наталля КАРПЕНКА.**

# СУСЕДЗІ СВАРАЦЦА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»)*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»)*

## Насустрач прадпрымальнікам

Яшчэ адна сям'я — на гэты раз прадпрымальнікаў з Салігорска — прыйшла паскардзіцца на парушэнне дагавора арэнды.

На працягу 12 гадоў прадпрымальнікі арандуюць у абласной арганізацыі памяшканне для сваёй студыі пашыву штор. На вытворчасці задзейнічана 6 чалавек. Цяпер іх датэрмінова просяць выехаць.

Як патлумачылі раённыя ўлады, пусты будынак, што раней быў на балансе ЖКГ, набылі з мэтай арганізацыі там паслуг па аздараўленні насельніцтва, але з-за страт, якія арганізацыя панесла ў першым паўгоддзі, яна вымушана пазбавіцца ад будынка, перадаць яго назад, у камунальную ўласнасць горада. Горад не супраць, бо ўжо ёсць і ахвотнікі выкарыстаць гэтую плошчу. А студыі штор прапанавалі шэраг іншых памяшканняў для арэнды.

Барыс Батура паабяцаў прадпрымальнікам, што прапанаваныя варыянты будуць не горшымі па ўмовах, а арэнда — не вышэй, чым была. Аднак самі скаржнікі з такой перспектывай не пагадзіліся: «Навошта нас выганяць, калі гэтае памяшканне ўсё роўна будзе здавацца ў арэнду?» Апроч таго, сям'я за ўласныя сродкі адрамантавала дах над сваім вытворчым памяшканнем, 12 гадоў даводзіла да ладу арэндаваную плошчу, а на новым месцы давядзецца зноў усё пачынаць з нуля. У рэшце рэшт старшыня Мінаблвыканкама пайшоў насустрач салігорскім прадпрымальнікам і папрасіў райвыканкам знайсці магчымасць пакінуць студыю штор у іх ранейшым памяшканні.

Не апошнюю ролю ў прыняцці такога рашэння адыграў той факт, што з-за адсутнасці подпісу аднаго чыноўніка ўжо 1,5 года прадпрымальнікі не могуць адкрыць сваю абутковую майстэрню. Прытым, што за ўласныя сродкі людзі зрабілі праект рэканструкцыі будынка майстэрні і правялі ўсе неабходныя работы. Засталося здаць майстэрню ў эксплуатацыю. Аднак паколькі не хапае аднаго подпісу — працаваць яны не могуць. Давялося старшыні Мінаблвыканкама самому забіраць дакументы на подпіс у Мінск. «Гэта недапушчальна», — ацаніў ён сітуацыю.

Не задаволіла Барыса Батуру і праца Слуцкага райвыканкама па вырашэнні пытання жыхара вёскі Нявязцы, які таксама вымушаны быў звярнуцца да кіраўніка абласнога выканаўчага камітэта па дапамогу. Выдатны камбайнер, перадавік вытворчасці вырашыў узяць крэдыт і працаваць фермерам. Натуральна, яму неабходны ўчастак зямлі для фермерскай гаспадаркі, якую ён просіць выдзеліць у сваёй жа вёсцы. Цікава, што папярэдняя згода ад мясцовай улады была атрымана, але далей справа так і не зрушылася. Па словах намесніка старшыні райвыканкама, столькі, колькі просіць камбайнер, — 50 га — на акрэсленай тэрыторыі выдзеліць яны не могуць, бо там засяроджана вялікая колькасць буйной рагатай жывёлы СВК. Апроч таго, там цяпер будуецца яшчэ адна ферма. З гэтай прычыны раён прапанаваў будучаму фермеру зямлю за 50 км ад яго вёскі. Такі варыянт не задаволіў ні фермера, ні Барыса Батуру, які паставіў задачу за два дні разабрацца з пытаннем і выдзеліць зямлю там, дзе просіць чалавек.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

*Салігорскі р-н.*

# Спадзяемся на свядомасць гаспадароў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»)*

Выявіць антыбіётыкі больш складана. Калі хтосьці з гаспадароў пачынае лячыць сваю карову і выклікае ветурача, той нам адразу паведамляе пра гэта. Значыць, мінімум 10 дзён мы не прымаем ад такой каровы малако. А перад тым, як аднавіць прыём, абавязкова робім аналіз на вызначэнне якасці малака.

Сельвыканкам атрымлівае даплату за ажыццяўленне збору малака, але гэтыя сродкі расходуюцца на закуп інвентару, на рамонт транспарту, на набыццё спецвопраткі, хімпрэпаратаў для правядзення аналізу (а каштуюць яны цяпер дорага). Нашы малаказборшчыкі выкарыстоўваюць конную цягу, таму асобна мы даплачваем ім за ўтрыманне коней, за работу ў зімовых умовах. Летам збор малака ажыццяўляецца кожны дзень, зімой — у залежнасці ад абстаноўкі. У нас ёсць населеныя пункты, дзе ўсяго па 2 каровы. Туды зімой малаказборшчык можа ездзіць праз дзень — калі дамовіцца з гаспадарамі.

Самая галоўная задача сельвыканкама — работа з людзьмі і арганізацыя належнага кантролю за якасцю здадзенага малака. Калі выявяцца інгібіруючыя рэчывы — будуць вяртанні, а гэта вельмі непрыемная сітуацыя. Паспрабуй потым патлумачыць людзям, чаму з-за кагосьці аднаго вярнулі малако ўсім, хто вінаваты і як вернутае малако дзяліць?

Кожны раз правяраць малако ад кожнай каровы на наяўнасць антыбіётыкаў немагчыма — гэта вельмі дарагое задавальненне, таму правяраецца агульная партыя — ужо на ферме. Да гэтага некалькі разоў мы зноў жа рабілі нечаканыя выбарачныя праверкі, і цяпер людзі ведаюць, што гэта магчыма. Праўда, з-за высокага кошту такога аналізу апошнія 4 месяцы мы яго не практыкуем, таму пытанне свядомасці гаспадароў застаецца актуальным. Як і пытанне своечасовай інфармацыі аб тым, што хтосьці пачаў лячыць карову.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

**ФАКТ**

## ЭЛЕКТРАКАРДЫЯГРАМА — ПА ТЭЛЕФОНЕ

**На станцыі хуткай і неадкладнай дапамогі ўкаранілі новую тэхналогію — перадачу электракарыяграмы па тэлефоне, паведамляе інтэрнэт-сайт Гродзенскага гарвыканкама.**

Перадатчык ЭКГ дазваляе перадаць зарэгістраваную ў аўтаматычным рэжыме электракардыёграфам «Альтонік-06» электракардыяграму па звычайным тэлефоне (альбо сотавым) дзяжурнаму кардыёлагу ў абласны кардыялагічны дыспансэр і адразу атрымаць яго заключэнне. Такія магчымасці дазваляюць брыгадзе хуткай дапамогі аператыўна мець больш поўныя вынікі абследавання пацыента.

Гэтымі прыборамі аснашчаны дзевяць брыгад хуткай дапамогі, у тым ліку ў горадзе Скідзелі, пасёлку Сапоцкін і вёсцы Індура.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


06 сентября 2011 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».

Повестка дня:

1. О списании дебиторской задолженности.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Московская, 360.

Начало регистрации участников собрания — 13.30. УНП 200295903



**г. ВИТЕБСК** **28.09.2011**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| **Начальная цена недвижимости снижена на 20 %** | | | | |
| 1. | Необслуживаемый регенерационный пункт (НРП-8), расположенный по адресу: Витебская области, Лепельский р-н, М-3, вблизи дер. Черноручье, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объектов недвижимости: - капитальное строение с инвентарным номером 230/С-12552 (здание нежилое) – одноэтажное железобетонное здание, фундамент железобетонный, крыша совмещенная, рулонная, общая площадь 48 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 222700000001000574 площадью 0,0099 га для содержания и обслуживания здания необслуживаемого регенерационного пункта (НРП-8). Использование для размещения административно-производственного объекта, сроком аренды 99 лет. Ограничение в использовании в связи с расположением объекта в водоохранной зоне вне прибрежной полосы реки Эсса площадью 0,0099 га. | **15 420 001** | **1 542 000** |
| 2. | Здание НРП-7 ВОЛС33, расположенное по адресу: Витебская область, Ушачский р-н, Жарский с/с, Р46, 15-й км, вблизи дер. Вацлаво-во, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 234/С-6335 (здание нежилое), одноэтажное железобетонное здание, фундамент железобетонный, крыша совмещенная, рулонная, общая площадь 46,8 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 224982400001000017, площадь 0,0084 га для содержания и обслуживания здания необслуживаемого регенерационного пункта (НРП-7), сроком аренды 50 лет. | **15 710 608** | **1 571 060** |
| 3. | Здание НРП-6 ВОЛС33, расположенное по адресу: Витебская область, Ушачский р-н, Ушачский с/с, Р29, вблизи дер. Матырино, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 234/С-6336 (здание нежилое), одноэтажное железобетонное здание, фундамент железобетонный, крыша совмещенная, рулонная, общая площадь 48,5 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 224983000001000006, площадь 0,0100 га для обслуживания здания необслуживаемого регенерационного пункта (НРП-6), сроком аренды 50 лет. | **15 491 543** | **1 549 150** |
| 4. | Техздание НРП-5 ВОЛС33, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий р-н, Ветринский с/с, дер. Быковщина, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 250/С-34877 (здание специализированное связи), одноэтажное каменное здание, фундамент бетонный, крыша рулонная, общая площадь 47,1 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 223881701601000019, площадь 0,0096 га для содержания и обслуживания техздания НРП-5 ВОЛС33, сроком аренды 50 лет. Использование для размещения объектов связи, энергетики, по ремонту и обслуживанию автомобилей, коммунального хозяйства, по обработке древесины и производства изделий из дерева, складов и хранилищ. | **14 858 409** | **1 485 840** |
| 5. | Здание гаража и мастерской, расположенные по адресу: Витебская область, Оршанский р-н, Высокский с/с, 5, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 240/С-18920, одноэтажное каменное здание вспомогательных служб (гараж и мастерская), фундамент железобетонный, крыша совмещенная, общая площадь 675,0 кв.м. Назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), гараж. Земельный участок: с кадастровым номером 223681100001000011, площадь 0,2351 га для обслуживания здания гаража и мастерской, сроком аренды 35 лет. Ограничения в использовании в связи с его расположением в охранных зонах линии связи и радиофикации и линии электропередачи напряжением до 1000 В, охранной зоне канализационного коллектора. | **125 937 902** | **12 593 790** |
| 6. | Здание почтового отделения, расположенного по адресу: Витебская область, Сенненский район, Белицкий с/с, д. Нерейша, д. 2, и на право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 242/С-5513 (здание специализированное связи) – одноэтажное сборно-щитовое здание, фундамент бетонный, крыша шиферная, перекрытия деревянные, утепленные, общая площадь 40,7 кв.м. Земельный участок с кадастровым номером 224480807601000002 площадью 0,0213 га для содержания и обслуживания почтового отделения, сроком аренды 35 лет. | **17 937 095** | **1 793 700** |
| 7. | Отделение почтовой связи с холодной пристройкой, расположенное по адресу: Витебская область, Ушачский район, Веркудский с/с, д. Туросполье, д. 35А, и на право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 234/С-5946 (сооружение специализированное связи), одноэтажное бревенчатое, фундамент бутовый, крыша шиферная, перекрытия деревянные, общая площадь 57,7 кв.м, холодная пристройка. Земельный участок: с кадастровым номером 224982009601000001, площадь 0,0738 га для содержания и обслуживания отделения почтовой связи, сроком аренды 50 лет. | **10 250 302** | **1 025 030** |
| 8. | Отделение связи с сенями, расположенное по адресу: Витебская область, Городокский район, Стодолищенский с/с, д. Привальни, 1А, и на право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-10070 (здание специализированное связи), одноэтажное бревенчатое, фундамент бутобетонный, крыша шиферная, общая площадь 24,4 кв.м, сени. Земельный участок: с кадастровым номером 221880416101000054, площадь 0,0024 га для размещения объектов связи, сроком аренды 99 лет. | **4 687 491** | **468 740** |
| 9. | Почтовое отделение с сенями, расположенное по адресу: Витебская область, Городокский район, Межанский с/с, д. Озерки, 5А, и на право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-10064 (здание специализированное связи), одноэтажное бревенчатое, фундамент бутобетонный, крыша шиферная, перекрытия дощатые, общая площадь 44,9 кв.м, сени. Земельный участок: с кадастровым номером 221886205201000002, площадь 0,0175 га для использования под пункт связи в д. Озерки, сроком аренды 99 лет. Ограничения – нахождение в водоохранных зонах и прибрежных полосах водоемов (озеро Озерки), площадь 0,0175 га. | **8 770 087** | **877 000** |
| 10. | Отделение связи, расположенное по адресу: Витебская область, Россонский район, Клястицкий с/с, д. Клястицы, ул. Школьная, д. 8, и на право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 253/С-493431(здание специализированное связи), одноэтажное кирпичное, оштукатуренное, фундамент бутовый, крыша асбестоцементные волнистые листы, перекрытия деревянные, общая площадь 142,4 кв.м, с бетонным крыльцом. Земельный участок: с кадастровым номером 224282004601000399, площадь 0,0364 га для обслуживания отделения связи, сроком аренды 25 лет. | **69 431 001** | **6 943 100** |

1. ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон/факс в г. Витебск: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

2. Аукцион состоится **28.09.2011 г.** в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, последний день приема документов **27.09.2011** до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников **28.09.2011** с 14.00 до 15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет **№ 3642903027026** в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка, внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка **в сумме 3 миллионов рублей по каждому лоту**; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Подробная информация об условиях участия в аукционе и условиях продажи предметов аукциона опубликована ранее: по лотам №№ 1–5 в газете «Звязда» от 29.04.2011 № 57 (26921); по лотам №№ 6–10 в газете «Звязда» от 22.04.2011 № 75 (23939).



Минский городской центр недвижимости

**Извещение о проведении 26 сентября 2011 года открытого аукциона по продаже здания санатория-профилактория «Мечта» в районе дер. Подгорье (Крыжовка) Минского района**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)** | Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-46902, назначение – здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей, наименование – санаторий-профилакторий. Площадь здания 3250,6 кв.м |
| **Сведения о земельном участке** | Кадастровый номер 623681700001000160, площадь – 2,9131 га, назначение – для обслуживания зданий и сооружений профилактория |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | Минская обл., Минский р-н, район д. Подгорье, санаторий-профилакторий «Мечта» |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Минский моторный завод», ул. Ваупшасова, 4, 220070, г. Минск |
| **Сведения об организаторе аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 2 143 025 556 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 150 000 000 белорусских рублей |
| **Наличие обременений** | Аренда |

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Минский моторный завод», утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о государственной регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Аукцион состоится **26 сентября 2011 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 26.08.2011 по 23.09.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 13.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости», (017) 230 22 07 – ОАО «Минский моторный завод».**


# Выкінуў стрэльбу і ўцёк

Работнікі Ганцавіцкай міжрайінспекцыі вырашылі праверыць дакументы ў групы паляўнічых. Адзін з іх не падпарадкаваўся гэтаму патрабаванню, выкінуў незарэгістраваную стрэльбу і ўцёк. Аднак неўзабаве асоба гэтага «незнаёмца» была высветленая. Ім аказаўся машыніст мыйных машын Баранавіцкага філіяла ААТ «Беларусьнафта». У дачыненні да яго складзены пратаколы за незаконнае паляванне і непадпарадкаванне законнаму патрабаванню службовай асобы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ** ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

**Галоўны рэдактар**
**НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.**
**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Наталля.**

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 33.380.** **Нумар падпісаны ў 19.30 24 жніўня 2011 года.**

# СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!


**ПАДПІСКА НА 4-ы КВАРТАЛ 2011 ГОДА**
*Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)*

| Індэкс | месяц | квартал |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 14600 | 43800 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 13400 | 40200 |
| 63858 (ведамасны) | 24800 | 74400 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 22200 | 66600 |

*Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белпошта»*

| Індэкс | месяц | квартал |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 13350 | 40050 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 12150 | 36450 |
| 63858 (ведамасны) | 22511 | 67533 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 20140 | 60420 |

*Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белсаюздрук»*

| Індэкс | месяц | квартал |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 13250 | 39750 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 12120 | 36360 |
| 63858 (ведамасны) | 19591 | 58773 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18063 | 54189 |

*Заставайцеся з намі!*


Краіна здароўя
Выпуск № 50 (286)

## НОВЫЯ ФІКСУЮЧЫЯ ПАВЯЗКІ АД «СТУЖКІ»

**ААТ «Стужка» пашырае асартымент вырабаў медыцынскага прызначэння: ён папоўніўся новымі фіксуючымі павязкамі.**

Яны выраблены з эластычнага сеткава-трубчатага бінту і прызначаны для фіксацыі перавязачных сродкаў. Павязка надзяваецца на накладзены бінт ці сурвэтку і забяспечвае шчыльнае пруляганне перавязачных сродкаў на любых частках цела за кошт большай эластычнасці, патлумачылі ў канцэрне «Беллегпрам». Цяпер медыцынскія перавязачныя матэрыялы вытворчасці ААТ «Стужка» можна будзе набыць не толькі ў аптэках, але і з верасня — у фірмовай тавараправоднай сетцы прадпрыемства. Нагадаем, што бінты і сурвэткі ад названага прадпрыемства адпавядаюць сучасным еўрапейскім стандартам. Напрыклад, перавагай бінтоў вытворчасці ААТ «Стужка» з'яўляецца край, які не асыпаецца, што дазваляе выключыць пападанне канцоў нітак у рану, паскарае працэс перавязкі за кошт таго, што бінт лёгка скручваецца з рулона, ды і сама павязка выглядае больш эстэтычна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Здароўе на талерцы

# ЯБЛЫК ДОКТАРА ВАРТЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ЯБЛЫКІ здаўна былі добра знаёмай садавінай, і без страў з іх выкарыстаннем не абыходзілася ніводная святочная бяседа. Але справа была, вядома ж, не толькі ў смакавых якасцях яблыкаў — народ ведаў і цаніў цудадзейную сілу гэтага дарунка прыроды. Нездарма ж нарадзілася мноства прыказак і прымавак пра яблыкі: «Любую немач яблыкам заядзім», «Месяц жнівень яблыкамі пахне», «На другі Спас і жабрак яблык з'есць». А яшчэ ўспомнім казку пра сакаўны яблычак і сярэбраны сподачак, казку пра маладзільныя яблыкі, а таксама біблейскае паданне пра тое, што Ева спакусіла Адама менавіта яблыкам. І спакусіцца было чым.**

Яблыкі — прыродная крыніца пекціну, які ў стрававальным тракце не ператраўліваецца, затое з'яўляецца своеасаблівай «мяцёлкай» для арганізма. Набрыньваючы ў кішэчніку, пекцін адсарбуе шкодныя прадукты абмену, а таксама цяжкія металы, радыенукліды, таксіны. Менавіта таму дзёртыя яблыкі лічацца старым і выпрабаваным хатнім сродкам пры паносах.

Дыета, абагачаная пекцінам, садзейнічае зніжэнню «дрэннага» халестэрыну, а як вынік — змяншаецца рызыка развіцця атэрасклерозу. Пекцін выводзіць з арганізма недаакісленыя прадукты абмену, якія з'яўляюцца агрэсіўнымі фактарамі ў развіцці анкалагічных і аўтаімунных захворванняў. Для інтэнсіўнай ачысткі арганізма, а таксама пры ацёках сардэчнага і ныркавага паходжання карысна рабіць адзін раз на тыдзень разгрузачны дзень, на працягу якога трэба з'ядаць 1,5—2 кг сырых або печаных яблыкаў і выпіваць 4 шклянкі несалодкай гарбаты. Такая разгрузка таксама дазваляе пазбавіцца ад 0,5 да 1 кг вагі, паколькі яблыкі — нізкакаларыйны прадукт (усяго 50 ккал у 100 г).

Яшчэ адзін цікавы факт: той, хто рэгулярна з'ядае яблык перад ядой, аўтаматычна стымулюе работу кішэчніка і пазбаўляецца ад запораў.

Яблыкі надзвычай багатыя на арганічныя кіслоты, перш за ўсё яблычную, лімонную і вінную, якія ў комплексе з пекцінам і дубільнымі рэчывамі садзейнічаюць аздараўленню кішэчнай мікрафлоры, змяншаюць гніласныя і брадзільныя працэсы ў кішэчніку. А падтрыманне нармальнага мікрабіялагічнага фону кішэчніка забяспечвае надзейную імунную абарону арганізма.

Пры ўжыванні яблыкаў з лекава-прафілактычнай мэтай варта мець на ўвазе, што падбіраць гатункі яблыкаў неабходна ў залежнасці ад паказанняў. Пры дыскінезіі жоўцевых шляхоў, гастрыце з паніжанай кіслотнасцю страўнікавага соку рэкамендуюць свежыя кісла-салодкія яблыкі. Пры вострых і хранічных калітах прызначаюць працёртыя салодкія яблыкі. (Дарэчы, яблычную кашку варта з'ядаць адразу, паколькі яна хутка кісне і цямнее.) А вось тым, хто пакутуе на гастрыт з павышанай кіслотнасцю і язву страўніка, з кіслымі яблыкамі трэба быць асцярожнымі. Праўда, язвеннікам можна есці запечаныя яблыкі.

У яблыках прысутнічаюць амаль усе водарастваральныя вітаміны, найбольш значныя ў колькасных адносінах — вітаміны C, $B_6$, $B_9$, P, карацін. У іх таксама прадстаўлены шырокі спектр мінералаў і мікраэлементаў, у якім дамінуе калій. З вугляводаў у яблыках пераважае фруктоза, таму яны не супрацьпаказаны нават пры цукровым дыябеце. Такім чынам, яблыкі садзейнічаюць захаванню добрай формы, прадухіляюць развіццё многіх хвароб. Нездарма ў англічан існуе прыказка: «Яблык у дзень — і доктар не спатрэбіцца».

### ЯКІЯ ЯБЛЫКІ БОЛЬШ КАРЫСНЫЯ?

Адказ на гэтае пытанне абсалютна адназначны: безумоўна, тыя, якія растуць на вашым дачным участку. І вядома ж, чым даўжэй яблыкі захоўваюцца, тым менш у іх застаецца карысных рэчываў. А таму прыгожыя, глянцавыя яблыкі, якія можна набыць вясной у любым супермаркеце, не маюць да вітамінаў ніякага дачынення. Але калі вясной у вас, хутчэй за ўсё, проста не будзе выбару, паколькі іншых яблыкаў вы проста не знойдзеце, то купляць блiскучыя заморскія плады цяпер — мякка кажучы, неразумна.

Прычын, чаму варта аддаць перавагу, напрыклад, роднай антонаўцы, а не якому-небудзь заморскаму гатунку, некалькі.

Па-першае, імпартныя яблыкі для далёкай транспарціроўкі звычайна пакрываюць слоем шкоднага для нашага здароўя воску, які цалкам не адмываецца нават шчоткай і гарачай вадой.

Па-другое, па сваім складзе паўднёвыя гатункі моцна саступаюць тым, што выраслі ў сярэдняй паласе. У іх значна менш вітамінаў (асабліва вітаміну С), карысных арганічных кіслот, мінералаў і ферментаў. Часткова гэта тлумачыцца кліматычнымі ўмовамі і гатунковымі адрозненнямі, а часткова — тым, што паўднёвыя яблыкі звычайна зрываюць недаспелымі, каб яны лепш перанеслі транспарціроўку і даспелі ўжо ў дарозе. Аднак многія карысныя рэчывы здольныя ўтварацца толькі ў тых пладах, якія выспелі на дрэве. Дарэчы, цукру ў паўднёвых гатунках яблыкаў значна больш, чым у нашых, — а гэта для арганізма не вельмі карысна.

Акрамя таго, вучоныя лічаць, што ў чалавека на генетычным узроўні закладзена перавага менавіта мясцовай садавіны, а таму на ўсялякую заморскую (нават калі гэта і яблыкі) арганізм можа адрэагаваць неадэкватна, напрыклад, узнікненнем алергіі.

### ЯК ЗАХОЎВАЦЬ?

- Трымайце яблыкі ў цёмным халаднаватым месцы або ў халадзільніку. Выкідвайце ўсе пашкоджаныя плады, бо яны сапсуюць усе астатнія.
- Нарэзаныя яблыкі хутка акісляюцца і становяцца карычневымі, таму не падрыхтоўвайце іх загадзя. Каб запаволіць гэты працэс, пакладзіце яблыкі ў міску з халоднай вадой, у якой разведзены лімонны сок. Але не захоўвайце яблыкі ў такім выглядзе доўга, бо вада паўплывае на смак і водар пладоў.

### ЯБЛЫЧНАЯ ПЕКЦІНАВАЯ НАРЫХТОЎКА

Каб гаючы пекцін быў заўсёды пад рукой, зрабіце ў сезон яблычнага багацця нарыхтоўку. Для яе падыдуць не толькі цэлыя яблыкі, але і жамерыны пасля выціскання соку, і лупіна, і асяродак. Можна выкарыстоўваць любыя яблыкі — і кіслыя недаспелыя і нават апады нізкіх гатункаў.

**Інгрэдыенты:** *1 кг яблыкаў, 1 л вады на 1 кг цэлых яблыкаў або 1,5—2 літры на 1 кг жамерын, сок невялікага лімона (замест соку можна ўзяць 2 г лімоннай кіслаты).*

**Прыгатаванне:** яблыкі здрабніць, пакласці ў каструлю, заліць вадой, дадаць сок лімона і варыць на слабым агні 40—50 хвілін (лупіну і жамерыны — 60—70 хвілін). Адцадзіць сок праз палатняную тканіну і ўварваць да 1/4 аб'ёму. Для гэтага сок выліць у пасудзіну з шырокім дном слоем не больш як 3 см і падагрэць, не дапускаючы кіпення. Затым разліць у гарачыя бутэлькі або слоікі і пастэрызаваць пры 90°С каля 10 хвілін. Адразу ж адцадзіць.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Да ведама

# АБДЫМКІ КАХАНАГА — ЛЕПШАЕ СНАТВОРНАЕ!

**ПАСТАЯННАЕ недасыпанне пагражае рызыкай займець парушэнне псіхікі. Таму, калі паўночны падлік авечак не дапамагае трапіць у абдымкі Марфея, трэба тэрмінова прымаць меры.**

ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА. Паспрабуйце на працягу дня рабіць фізічныя практыкаванні. А яшчэ лепш купіце абанемент у спартзалу або ў басейн. Не важна, што вы выбераце. Галоўнае — каб да вечара вы проста валіліся з ног (у прамым сэнсе гэтага слова), тады здаровы сон вам гарантаваны. Толькі ўлічвайце, што за 2—3 гадзіны да сну вымотваць свой арганізм фізічнай нагрузкай непажадана.

НЕ ВАРТА ПЕРАД СНОМ УПЛЯТАЦЬ ЗА АБЕДЗВЕ ШЧАКІ «творы кулінарнага майстэрства». Поўны страўнік не спрыяе сну, таму вячэра павінна быць лёгкай. Кубак цёплага малака, лёгкая салата, садавіна — гэта тое, што трэба. Але калі выстаяць перад спакусай няма сіл, не лажыцеся спаць хаця б на працягу трох гадзін пасля сытнай вячэры.

ПРЭЧ ТРЫВОГІ І ХВАЛЯВАННІ. Кожнаму з нас уласціва хвалявацца. Толькі вось улічыце, што гэта з'яўляецца марнаваннем часу і здароўя, тым больш перад сном. Паколькі сітуацыю вы не выправіце, а сябе знясіліце канчаткова. Таму, нават калі ўдзень і адбылося нешта незвычайнае, не варта ламаць галаву над тым, як зрабіць каму-небудзь штосьці мярзотнае. Бо менавіта ж ад гэтага ўзнікае стрэс і бессань. Лепш скажыце сабе «пераначуем, больш пачуем» — і паспрабуйце расслабіцца. А вось калі вы засняце ва ўзбуджаным стане, ваш арганізм не зможа аднавіць сілы да абуджэння.

АДМОЎЦЕСЯ АД АЛКАГОЛЮ ПЕРАД СНОМ. Вядома, келіх чырвонага віна за вячэрай не пашкодзіць вашаму начному адпачынку. Затое завяршэнне працоўнага дня чаркай-другой больш моцнага напою да дабра не давядзе. Праўда, існуе і такое меркаванне. Маўляў, спіртное дапамагае заснуць. Доля ісціны ў гэтым, безумоўна, ёсць. Заснуць вы засняце, ды вось толькі спаць будзеце неспакойна і прачняцеся рана (вядома, па якой прычыне).

ЦЁПЛАЯ ВАННА. Ні для каго не сакрэт, што цёплая ванна — выдатны спосаб расслабіцца. Таму не варта грэбаваць «лазневымі» працэдурамі: паплёскайцеся перад сном хвілін 20 у ванне. Не пашкадуеце!

БОЛЬШ СВЕЖАГА ПАВЕТРА. Прагулка перад сном акажацца вельмі карыснай: яна не толькі дапаможа расслабіцца, але і паслужыць нагодай правесці вечар у прыемнай кампаніі.

ЧЫТАННЕ. Прыемнае баўленне часу, тым больш перад сном: яно не толькі забаўляе, але і... усыпляе. Таму назапасьце глянцавых часопісаў, кніжак любімага аўтара — і наперад! Альтэрнатывай такому снатворнаму можа быць праслухоўванне спакойнай музыкі. Так, напрыклад, даказана, што мелодыі Моцарта здымаюць нервовасць.

ЗДАРОВЫ СОН — СЯБАР ПУНКТУАЛЬНЫХ ЛЮДЗЕЙ. Лепш за ўсё адпраўляцца да сну і прачынацца ў адзін і той жа час.

СПАЛЬНЯ — КРАІНА СНОЎ. Памятайце, што спальня прызначана толькі для сну. Таму ўся абстаноўка павінна ў вас асацыявацца толькі з прыемным начным адпачынкам. І зусім не абавязкова, лежачы ў ложку, набіраць на ноўтбуку тэкст або займацца архіважнымі падлікамі. Лепш прыадчыніце фортачку і кладзіцеся спаць.

І ЯШЧЭ. УСПОМНІЦЕ ПРА КАХАНАГА (КАХАНУЮ). Прыемныя ўспаміны залацістай сцяжынкай вядуць у краіну сноў. А калі другая палавінка знаходзіцца пад бокам, абдыміце яе — і не заўважыце, як засняце. Паколькі падчас сну адбываецца абмен энергіяй, засынаць у абдымках каханага чалавека — сакрэт не толькі здаровага, але і прыемнага сну.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

# ВЫСОКІ ЦІСК? ГЭТА НЕБЯСПЕЧНА!

**КАЛІ наш чалавек ідзе да доктара па дапамогу? Правільна: калі нешта баліць, або калі становіцца дрэнна настолькі, што сіл няма трываць. А тое, што ціск часам падскоквае аж пад дзвесце — гэта нярэдка яшчэ і падстава для бравады: маўляў, вы лежма ляжыце пры ста пяцідзесяці, а я і пры двухстах малайчына. Чаму ж гіпертанію трэба лячыць?**

**Прычына першая.** Гіпертанія значна павышае рызыку развіцця інсульту (кровазліцця ў мозг). Гэтае ўскладненне не толькі небяспечнае для жыцця, але можа зрабіць чалавека бездапаможным інвалідам, прыкаваць да пасцелі. Некаторыя хворыя пасля інсульту страчваюць здольнасць гаварыць, іншых паралізуе — кагосьці на час, а кагосьці і на ўсё астатняе жыццё. Падобная перспектыва наўрад ці здасца прывабнай.

**Прычына другая.** Трапіць у бальніцу з інфарктам гіпертонік мае значна больш шанцаў, чым чалавек з нармальным ціскам. А колькі людзей з інфарктамі не паспявае дачакацца хуткай дапамогі!

**Прычына трэцяя.** Гіпертанія плюс атэрасклероз плюс інфаркт роўна сардэчнай недастатковасці. Сама па сабе гіпертанія не прыводзіць да яе развіцця, калі ціск не мае звычаю падымацца вышэй за 200 мм рт. сл. Але высокі ціск — першая прыступка на шляху да развіцця атэрасклерозу. Другой прыступкай можа стаць інфаркт. Чым больш складнікаў у гэтым ураўненні, тым хутчэй развіваецца слабасць сардэчнай мышцы з яе праявамі: задышкай, ацёкамі; калі пад'ём па лесвіцы нават на адзін паверх уяўляецца амаль невыканальным.

**Прычына чацвёртая.** Не шкадуе гіпертанія і ныркі, якія ачышчаюць кроў ад шлакаў. Парушыцца іх работа — арганізм перапоўніцца таксінамі. На апошніх стадыях нырачнай недастатковасці чалавек можа жыць, толькі калі яго падключыць да апарата «штучная нырка».

**Прычына пятая.** Гіпертанія — найбольш частая прычына развіцця расслойваючай анеўрызмы аорты, самага буйнога сасуда ў арганізме чалавека. Разрыў анеўрызмы, хоць і параўнальна рэдкае, але грознае ўскладненне, цягне за сабой раптоўную смерць.

**Прычына шостая.** Гіпертонікі са стажам часта скардзяцца, што яны дрэнна запамінаюць нумары тэлефонаў, перастаюць пазнаваць у твар знаёмых і не памятаюць, як тых завуць. Дрэнная памяць — наступства парушэння кровазабеспячэння галаўнога мозга.

**Прычына сёмая.** Змены ў сасудах вочнага дна пры гіпертаніі прыводзяць да пагаршэння зроку, а кровазліццё ў сятчатку вока на вышыні аднаго з пад'ёмаў ціску (крызаў) можа закончыцца слепатой.

**Прычына восьмая.** Галаўныя болі, галавакружэнне і проста дрэнны настрой адзначаюць амаль усе гіпертонікі. Яны часта нават і не падазраюць, што вінаваты ў іх дрэнным самаадчуванні высокі ціск.

**Прычына дзявятая.** У некаторых гіпертонікаў пад'ёмы ціску прыводзяць да крывацёкаў з носу, якія, хоць звычайна і не небяспечныя для жыцця, але задавальнення таксама не прыносяць.

**Прычына дзясятая.** І, нарэшце, гіпертанія крадзе і без таго нядоўгія гады, адпушчаныя чалавеку на гэтым свеце.

### ДАРЭЧЫ

**Навукоўцы сцвярджаюць, што да павышэння артэрыяльнага ціску можа прывесці недахоп сну. У амерыканскім часопісе «Гіпертэнзія» былі апублікаваны вынікі даследавання, якія гаварылі пра тое, што ў жанчын, працягласць сну якіх складае менш як 7 гадзін за ноч, існуе павышаная рызыка развіцця гіпертаніі. У даследаванні ўдзельнічала 10300 жанчын ва ўзросце 35—55 гадоў на працягу 5 гадоў. У параўнанні з жанчынамі, сон якіх доўжыўся 7 гадзін, у жанчын, сон якіх доўжыўся 6 гадзін, рызыка развіцця гіпертаніі была на 42% вышэй. У жанчын, якія спалі ў суткі не больш за 5 гадзін, гэта рызыка была вышэй на 31%.**

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Карысна ведаць

# ВОСЬ ДЫК ЯЗВА!

**НАВАТ здаровы страўнік чулліва рэагуе на рознага роду непрыемнасці, а ў язвеннікаў ён удвая больш адчувальны да неспрыяльных фактараў. Аднак затое бывае вельмі ўдзячны за клопат пра сябе. Праявіце асаблівую ўвагу да яго, каб пазбегнуць абвастрэнняў, якія ўзнікаюць з самых розных прычын.**

### ВІНАВАТЫ СТРЭС

Кожны з нас ведае па ўласным досведзе: варта моцна панервавацца, спалохацца або перахвалявацца, як адразу ж пачынае ныць «пад лыжачкай», або, як кажуць медыкі, у эпігастральнай вобласці, размешчанай у верхняй частцы жывата. Нічога дзіўнага! Ад засмучэнняў у страўніку выпрацоўваецца занадта шмат салянай кіслаты і змяншаецца ўтварэнне слізі, якая засцерагае сценкі гэтага органа ад запалення і самаператраўлівання. У выніку слізістая абалонка пакрываецца эрозіямі, а затым і язвамі, і тады дыскамфорт у верхняй частцы жывата змяняецца моцным болем. Пры гэтым ціск усярэдзіне страўніка павышаецца, яго сок закідваецца ў верхнія аддзелы стрававода, выклікаючы хімічны апёк з пашкоджаннем слізістай абалонкі, які суправаджаецца адчуваннем пякучага болю за грудзінай. Зусім як пры інфаркце міякарда, які ўзнікае на фоне стрэсу! Медыкам сапраўды прыходзіцца выключаць гэты дыягназ. Неверагодна, але факт: у 30—50% пацыентаў, шпіталяваных з сардэчным прыступам, на самай справе пад яго маркай хаваецца абвастрэнне язвавай хваробы. Пра тое, што вы сутыкнуліся менавіта з ёй, а не з класічным інфарктам, сведчыць адрыжка і кіслы прысмак у роце. Каб пазбегнуць абвастрэння на фоне вострага стрэсу, паспрабуйце супакоіцца самі і супакоіць страўнік: прыняць 10—15 кропель валакардзіну або карвалолу з невялікай колькасцю вады, а таксама выканаць невялікі комплекс ёгі, прызначанай спецыяльна для гэтага органа.

❒ Сядзьце на крэсла як звычайна або ў позу лотаса на падлогу. Пакладзіце левую далонь на верхнюю частку жывата. Сагніце правую руку, як быццам хочаце, каб вас выклікалі да дошкі, і павярніце далонню наперад на ўзроўні пляча. Сачыце вачамі за кончыкамі пальцаў правай рукі. Зрабіце ўдых і адначасова выштурхніце далонь наперад, выцягваючы руку пад прамым вуглом да тулава, як быццам зрушваеце цяжкі прадмет. На выдыху вярніце руку ў зыходнае становішча. Паўтарыце 7 разоў.

### ЗА ТЭРМІНАМ ПРЫДАТНАСЦІ...

Моцны боль у страўніку накшталт прыступаў язвавай хваробы выклікаюць і харчовыя атручэнні. Яны вядуць да вострага гастрыту, з-за якога зарубцаваныя язвы могуць адкрыцца, не кажучы ўжо пра з'яўленне новых. Сімптомы харчовай таксікаінфекцыі ні з чым не зблытаеш, таму што адначасова з рэззю ў эпігастрыі пачынаюцца млоснасць і ваніты, пасля якіх становіцца лягчэй. Праз некалькі гадзін боль распаўсюджваецца на ўвесь жывот (хоць у вобласці страўніка адчуваецца мацней), узнікае панос, павышаецца тэмпература, з'яўляецца моцная смага, а апетыт знікае.

Першае, што неабходна зрабіць у выпадку атручэння — прамыць страўнік растворам соды (1 ст. лыжка на літр гатаванай вады). Соду неабходна старанна размяшаць, пасля чаго крыху пачакаць, каб з раствору выйшлі пухіркі вуглякіслага газу. Такой вадкасці неабходна прыгатаваць шмат: да 3—4 літраў, паколькі пажадана некалькі разоў цалкам запоўніць страўнік хворага. Выпіце 3—4 шклянкі і выклічце ваніты («прамыванне» варта паўтарыць некалькі разоў да з'яўлення чыстай вады пасля выкліканых ванітаў). Пасля гэтага на працягу сутак устрымайцеся ад ежы, толькі піце пабольш — гарбату без цукру або адвар курагі, які аднаўляе страты калію. Потым з'ешце трохі аўсянкі, якая абвалаквае запаленую слізістую абалонку страўніка, і пачынайце патроху пашыраць рацыён.

### СОДА НЕ ЗАЎСЁДЫ НА КАРЫСЦЬ

Пасля ўжывання гэтага народнага сродку страўнік сапраўды можа разбалецца. Уступаючы ў рэакцыю з салянай кіслатой, сода ператвараецца ў кіслату вугальную, якая раскладаецца на ваду і вуглякіслы газ. Страўнікавае змесціва літаральна ўскіпае — $CO_2$ пузырыцца, расцягвае і раздражняе сценкі гэтага адчувальнага органа, і той бярэцца ўзмоцнена выпрацоўваць новыя порцыі салянай кіслаты. У выніку страўнік раздзімаецца і пачынае балець, а кіслотнасць павышаецца яшчэ больш!

Замест соды лепш выкарыстоўваць сучасныя антацыдныя сродкі (маалокс, фасфалюгель, смекту). Яны нармалізуюць кіслотнасць страўнікавага соку і супакойваюць запалёную слізістую абалонку, пазбаўляючы ад болю.

Можна нармалізаваць кіслотнасць і натуральнымі метадамі: фітанастоямі (чым больш гаркавіць раслінны напой, тым мацней ён ашчалачвае) і шчолачнай мінеральнай вадой («Есентукі-4», «Баржомі»). Падагрэйце ваду і выпусціце газ, энергічна памяшаўшы лыжкай у шклянцы, а затым выпіце вялікімі глыткамі палову або тры чвэрці шклянкі за гадзіну да яды 2—3 разы на дзень. Цёплая мінеральная вада тармозіць выдзяленне страўнікавага соку і робіць яго не такім кіслым, пазбаўляючы ад непрыемных адчуванняў у страўніку.

### КАЛІ РАЗДРАЖНЯЛЬНІК — ЛЕКІ

Налічваецца каля паўсотні прэпаратаў, ад якіх можа разбалецца страўнік. Заўважце: гэта здараецца не толькі, калі прэпарат трапляе ў арганізм праз рот, але нават пры яго ўвядзенні ўнутрымышачна, унутрывенна і ў свечках. Медыкаментознае пашкоджанне страўніка выклікаюць некаторыя гармоны, напрыклад, глюкакартыкоіды, прэпараты жалеза, хларыд калію, сульфат цынку, рэзерпін, некаторыя мачагонныя і антыдыябетычныя сродкі.

Аднак найбольшую шкоду шматпакутнаму органу наносяць так званыя нестэроідныя гарачкапаніжальныя, болесуцішальныя і супрацьзапаленчыя лекі, якія знойдуцца ў любой хатняй аптэчцы. Асабліва папулярныя ацэтылсаліцылавая кіслата (АСК, аспірын) і прэпараты, якія змяшчаюць яе (аскафен, цытрамон, асфен і іншыя), а таксама нестэроідныя супрацьзапаленчыя прэпараты (НСЗП), якія прымяняюцца пры астэахандрозе, рэўматызме і артрытах: бутадыён, ібупрафен, артафен (вальтарэн), індаметацын, напраксен.

Аказваючы тэрапеўтычны эфект, нестэроідныя сродкі парушаюць ахоўны бар'ер слізістай абалонкі страўніка: яна запаляецца і пакрываецца павярхоўнымі дэфектамі — эрозіямі, а затым язвамі. Пры бескантрольным ужыванні яны могуць нанесці шкоду нават здароваму страўніку, што ўжо казаць пра хворы! Самыя грозныя ўскладненні падобнай тэрапіі — перфарацыя (прабадзенне) органа і страўнікава-кішачны крывацёк (так званы «аспірынавы крывацёк»). Таму не займайцеся самалячэннем — заўсёды раймйцеся з доктарам, перш чым прымаць той або іншы прэпарат.

Каб зменшыць неспрыяльнае ўздзеянне лекаў на слізістую абалонку страўніка і кішэчніка, аддайце перавагу капсулам і таблеткам у абалонцы; ужывайце толькі тыя прэпараты, якія рэкамендаваў урач, і абавязкова ў строгай адпаведнасці з інструкцыяй. Напрыклад, таблеткі, якія змяшчаюць АСК і НСЗП, нельга піць на галодны страўнік — ён адрэагуе на гэта болем.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**




Фота БЕЛТА.

Інфарм-укол

## «Перамога» — за сардэчна-сасудзістымі

**Штогод у свеце ад сардэчна-сасудзістых хвароб памірае больш людзей, чым ад любых іншых хвароб. Прычынай смерці найчасцей становяцца ішэмічная хвароба сэрца, інсульт і іншыя формы цэрэбраваскулярнай хваробы.**

Ужыванне тытуню з'яўляецца адной з асноўных прычын развіцця многіх хвароб-забойцаў, уключаючы сардэчна-сасудзістыя хваробы, хранічную абструктыўную хваробу лёгкіх і рак лёгкіх. Увогуле ўжыванне тытуню прыводзіць да кожнага дзясятага выпадку смерці ў свеце сярод дарослых. У краінах з высокім узроўнем даходу звыш 2/3 насельніцтва жыве больш за 70 гадоў і памірае пераважна ад хранічных хвароб — сардэчна-сасудзістых, хранічнай абструктыўнай хваробы лёгкіх, ракавых хвароб, дыябету або дэменцыі. Лёгачныя інфекцыі застаюцца асноўнай інфекцыйнай прычынай смерці. У краінах з сярэднім узроўнем даходу каля паловы насельніцтва жыве да 70 гадоў, і хранічныя хваробы, як і ў краінах з высокім узроўнем даходу, з'яўляюцца асноўнымі прычынамі смерці. Аднак асноўнымі прычынамі смерці пры гэтым там з'яўляюцца туберкулёз, ВІЧ/СНІД і дарожна-транспартныя аварыі. У краінах з нізкім узроўнем даходу да 70 гадоў дажывае менш як адзін з пяці чалавек, і асноўнымі прычынамі гібелі з'яўляюцца пераважна інфекцыйныя хваробы — лёгачныя інфекцыі, дыярэйныя хваробы, ВІЧ/СНІД, туберкулёз і малярыя.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**


## Извещение об открытом аукционе по продаже права аренды земельных участков в г. Гродно

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | Условие продажи и целевое использование земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | м-н «Вишневец-4» (поз. по генплану № 90) | 0,0421 | 440100000003005136 | 72 000 000 | 7 200 000 | 3 006 519 | Строительство и обслуживание «Блока торгово-бытового назначения с аптекой»* |
| 2. | Право аренды земельного участка сроком на 10 лет | ул. Карского, 2Б | 0,4037 | 440100000001004285 | 169 000 000 | 16 900 000 | 2 620 772 | Строительство и обслуживание «Станции технического обслуживания автомобилей с автомойкой и магазином»* |
| 3. | Право аренды земельного участка сроком на 10 лет | ул. Соколовского | 0,1191 | 440100000001006272 | 61 000 000 | 6 100 000 | 3 108 804 | Строительство и обслуживание кафе на 100 мест* |

*Победитель аукциона обязан в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года, а также осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за объект осуществляется по безналичному расчету в течение 10-ти рабочих дней с момента вынесения решения горисполкома о передаче земельного участка победителю аукциона.

3) Победитель аукциона обязан течение 10-ти рабочих дней с даты принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

**Аукцион состоится 29 сентября 2011 года, в 16.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2**. Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Заявления принимаются с 25 августа по 23 сентября 2011 г.** Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

Канстанцін ЖУРАЎСКІ:

# «КАЛІ ЁСЦЬ ЦІКАВЫЯ ПРАЕКТЫ ЦІ ІДЭІ, ТО НЕ ТРЭБА БАЯЦЦА — ГРОШЫ Ў КРАІНЕ ЁСЦЬ»

**ПРА стварэнне свайго бізнэсу на якім-небудзь этапе жыцця задумваўся, магчыма, кожны з нас: нехта бачыць сябе ўладальнікам заводаў-газет-параходаў, а нехта — заснавальнікам невялічкай майстэрні ці крамы. Ідэя ёсць, жаданне працаваць ёсць, сябры-кампаньёны ёсць, але далей звычайна пытанне ўпіраецца ў грошы: дзе ўзяць стартавы капітал, калі яго няма? Вядома, трэба шукаць інвестара — чалавека, які паверыць у вашу ідэю і дасць вам грошай (вядома, не «за бясплатна», а з разлікам потым на вас зарабіць). Але дзе знайсці гэтага інвестара для свайго стартапа? Пра гэта і іншае мы пагутарылі з Канстанцінам ЖУРАЎСКІМ, сузаснавальнікам Стартап-уікэндаў, старшынёй савета ГА «Таварыства садзейнічання інавацыйнаму бізнэсу».**



**— Наколькі я разумею, менавіта вы дапамагаеце сустрэцца аўтарам праектаў і інвестарам, і адбываецца гэта праз правядзенне Стартап-школ і Стартап-уікэндаў. Раскажыце, у чым сутнасць гэтых мерапрыемстваў?**

— Стартап-школа — гэта комплекс падрыхтоўчых мерапрыемстваў перад Мінскім стартап-уікэндам — трохгадзіннымі штотыднёвымі заняткамі. Яны праходзяць бясплатна для ўсіх, хто хоча падаць свой праект або ўвайсці ў склад каманды ўжо існуючых стартапаў. Звычайна заняткі складаюцца з некалькіх этапаў — спачатку ідзе знаёмства з аўдыторыяй, майстар-клас якога-небудзь вядомага прадпрымальніка на зададзеную тэму, далей мы звычайна тэсціруем праекты па гэтай тэме, і пасля гэтага ўжо ідзе індывідуальная праца ў камандах. У чым сутнасць стартап-школ? У шмат каго ёсць праекты: як правіла, гэта на 80% ідэі, калі няма яшчэ рэальна існуючага бізнэсу. Вельмі рэдка да нас прыходзяць людзі, у якіх ёсць ужо існуючы бізнэс, нейкія даходы, зладжаная каманда. І задача стартап-школы — знайсці хібы, выправіць і дапрацаваць прадстаўленне праекта, каб ужо перад рэальнымі інвестарамі хлопцы выйшлі і не пападаліся на простыя пытанні, каб яны былі падрыхтаваныя і іх праект выглядаў максімальна добра.

**— Ці ёсць ужо рэальныя праекты, якія знайшлі свайго інвестара і пачалі рэалізоўвацца?**

— Ёсць, вядома. Узяць, напрыклад, праект стварэння крамы адзення для цяжарных: яны дастаткова ўдала выступілі на чацвёртым Мінскім стартап-уікэндзе, зацікавілі інвестара, працавалі з ім, на маладзевым інавацыйным форуме яны ўжо прадстаўлялі праект разам з інвестарам і на пытанні аўдыторыі адказвалі не яны, а інвестар. Сума інвестыцый там каля 40 тысяч долараў: 20 укладвае інвестар, 20 тысяч — гэта пазыка ў банку, якую яны атрымліваюць дзякуючы інвестару.

Яшчэ адзін праект, які называецца «Музей шакаладу», зараз у стадыі тэсціравання. Хто інвестар — пакуль не скажу. З больш істотных праектаў — «Мабільныя спадарожнікі», імі цікавіўся адзін наш IT-інвестар (ён увайшоў у праект, і зараз яны нешта распрацоўваюць), а таксама «GoodFood.by» — з імі працуе адзін з экспертаў. Насамрэч варта разумець, што ў нас няма такой культуры, калі ў стартапы адразу ўкладваецца шмат грошай — гэта расцягваецца на доўгі час: пакуль праект праверацць, з усіх бакоў «выліжуць».

Ну і самы буйны на сёння праект — гэта будаўніцтва завода па вытворчасці гіперпрэсаванай цэглы. Ён выйшаў ужо на дзяржаўны ўзровень, і, як аб'явіў інвестар праекта Алег Глазуноў, праект запушчаны, правераны і выйшаў на суму 5,6 мільёна долараў. Мяркуючы па усім, там будуць заходнія інвестары. Аўтар праекта — Алег Кіцыненка. Вось гэта пакуль у нас самы буйны праект, але я мяркую, што ён будзе канчаткова рэалізаваны толькі праз 1-1,5 года.

З апошніх стартап-уікэндаў гучна заявілі пра сябе MapsWithMe і Quote Roller — дзве каманды. Я ведаю дакладна, што яны нядаўна сустракаліся з прыватным інвестарам, былым прадстаўніком Mail.Ru і вялі перамовы — паглядзім, што далей будзе.

**— Атрымліваецца, што за гэты час ніводнага цалкам рэалізаванага праекта яшчэ няма?**

— Цяжка сказаць. Праінвеставанага поўнасцю — няма. Інвестыцыі атрымлівалі і атрымліваюць, але такіх, якія б выйшлі на пункт бясстратнасці — яшчэ няма.

**— Які сярэдні памер інвестыцый атрымліваюць стартапы?**

— Складанае пытанне. Ёсць тэарэтычны заходні вопыт, а ёсць наш, беларускі. На Захадзе — ад 5 тысяч долараў да некалькіх мільёнаў. Наогул, у іх трошкі іншая сістэма: там, у прынцыпе, нармальна, калі маленькая доля ў праекце набываецца за вялікія грошы дзеля хуткага выхаду. Як у фільме пра «Фэйсбук» — 7% за 500 тысяч долараў. У Беларусі гэта нерэальна. І то ў нас самыя мяккія ўмовы і самыя добрыя інвестары на постсавецкай прасторы: у нас патрабуюць усяго толькі кантрольны пакет — 51%. Але, праўда, адзін з інвестараў заявіў, што яго і 49% задаволіць. Для параўнання: расіяне заўсёды бяруць больш, чым кантрольны пакет, а ўкраінцы менш за 90% не бяруць ніколі. Так атрымліваецца з-за таго, што ў нас пакуль няма адпаведнага заканадаўства. На Захадзе інвестар абаронены, яго 7% не размываюцца і абаронены заканадаўствам. У нас інвестар сябе можа абараніць толькі праз набыццё кантрольнага або блакуючага пакета акцый.

Таксама на Захадзе дастаткова нармальная з'ява, калі камандзе даюць грошы на развіццё амаль без усялякіх гарантый. У нас жа сітуацыя іншая: спачатку праект вельмі доўга правяраюць, упэўніваюцца ў мадэлях. Карацей, інвестары нашы вельмі акуратныя, у тым ліку і з-за гэтай заканадаўчай неабароненасці. Наколькі я ведаю, у нас ёсць некалькі негатыўных прыкладаў, калі людзі згубілі свае грошы, уклаўшы іх у праект, аўтары якога потым зніклі. Праўда, там было ўсяго пару тысяч долараў.

Калі ж казаць пра сумы інвестыцый, то самы малы памер — каля тысячы долараў, а самы вялікі пакуль быў у таго цагельнага завода, пра які я ўжо казаў. А наогул, калі спасылацца на словы інвестараў, то яны гатовы ўкладваць і 10 тысяч долараў, і 30, і 200 тысяч. Не трэба забываць, што калі некалькі інвестараў аб'ядноўваюцца, то сумы могуць быць яшчэ большымі. Пытанне ў тым, каб сума была добра пралічана. Практычна заўсёды, калі на стартап-уікэнд заяўляецца сума, скажам, у 100 тысяч, то пасля дня працы аказваецца, што патрэбна ўсяго 20 тысяч. Але бываюць і праекты, дзе заяўляецца вельмі малая сума, а ў выніку атрымліваецца, што там патрэбны нашмат большыя інвестыцыі.

**— Вы казалі аб прагалах у заканадаўстве: патрабуецца спецыяльны закон у гэтай галіне?**

— Так, менавіта закон, дзе былі б прапісаны сам прынцып венчурнага ўкладання з малой доляй, прынцып вяртання сродкаў і г. д. У Расіі такая практыка нарадзілася не так даўно і цяпер набірае абароты. Але ў іх ужо ёсць судовая практыка, ёсць судовыя пастановы — можна пераймаць вопыт у іх. Таксама павінны быць зацверджаны нейкія ўзоры нерасплывістых фармулёвак дагавораў, якія б рэгулявалі адносіны паміж экспертамі, інвестарамі і аўтарамі праекта. Бо інвестар укладваецца грашамі, эксперт — ведамі, а аўтары праекта — ідэямі і працай. Дарэчы, у нас сам венчурны рух нарадзіўся гады тры таму. Да гэтага рынак таксама быў, але ён быў стыхійным.

**— Калі казаць пра венчурнае фінансаванне на Захадзе, то там людзі ўкладваюць у 10 праектаў, 9 з іх прагараюць, а на дзясятым інвестары адбіваюць усе выдаткі з лішкам. А ў нас інвестары хочуць, каб кожны праект быў прыбытковы...**

— Правільней кажучы, яны шукаюць толькі прыбытковыя праекты.

**— Але тады атрымліваецца, што гэта не зусім венчурнае фінансаванне...**

— У тым і справа. Паўтара года таму ў нас яшчэ наогул не было ні бізнэс-анёлаў, ні венчурных інвестараў. Усё венчурнае фінансаванне ў Беларусі зводзілася да таго, што калі нехта некага ведаў, то па сяброўству мог даць грошай. Калі мы пачалі стартап-уікэнды, мы імкнуліся якраз прывіць паняцце менавіта рызыкоўнага, бізнэс-анёльскага, венчурнага фінансавання. Пакуль гэта вельмі цяжка атрымліваецца. Бо трэба, каб людзі навучыліся не хавацца (а беларусы вельмі любяць хавацца). Але такія людзі знаходзяцца, яны заяўляюць пра сябе, яны сапраўды гатовыя інвеставаць: чыста, легальна, без усялякіх праблем. І таму паціху бізнэс-анёльскі дух пачынае фарміравацца, людзі пачынаюць інвеставаць, але гэта не так хутка, як хацелася б. Так, ёсць асобна IT-сфера, дзе венчурнае фінансаванне даўно прынятае, але традыцыйнаму бізнэсу да гэтага трэба яшчэ прыйсці. Таму я мяркую, што ў нас некалькі гадоў пройдзе, перш чым разаўецца венчурнае фінансаванне.

**— А якія сферы для інвестараў на сёння найбольш актуальныя, як лічыце?**

— Усё залежыць ад бізнэс-мадэлі, ад таго, як людзі жывуць праектам, на што яны гатовыя дзеля гэтага. Бо ўсё што заўгодна можа быць прыбытковым. Возьмем Ikea: нічога такога звышарыгінальнага, але пад гэтым брэндам мэбля прадаецца па шалёнай цане. Усё залежыць ад таго, як пастаўлена бізнэс-мадэль і якая гандлёвая марка. Так што, вылучыць нейкую асобную сферу не магу. Калі казаць менавіта пра Беларусь, то ў нашай краіне ў бягучы момант адзіны трэнд — гэта экпартаарыентаваная прадукцыя: тое, што можна прадаць за мяжу за долары і што пры гэтым не залежыць ад імпарту. А гэта ў нас што? Мазгі. Так што «айцішнікі» зараз на кані.

**— Нядаўна начальнік упраўлення навукі і інавацыйнай палітыкі Мінэканомікі Дзмітрый Крупскі заявіў, што венчурныя інвестыцыі ў нашай краіне пакуль развівацца не будуць, бо мы яшчэ не назапасілі столькі капіталу, каб яго ўкладаць на такіх умовах. А як лічыце вы: ці ёсць у нас перспектывы для венчурнага фінансавання?**

— Цікавая пазіцыя. Інвестары, якія былі на першым і другім нашым стартап-уікэндзе, аб'ядналіся ў Беларускую асацыяцыю венчурных інвестараў. У іх свае мэты і задачы, мы з імі не звязаны, але само іх існаванне гаворыць пра тое, што ў Беларусі венчурныя інвестыцыі вымушаны развівацца. І плюс мы робім шмат для таго, каб гэта фарміраваць. Так ці інакш, мы венчурны рынак усё-такі зробім. Капітал у краіне ёсць. Іншае пытанне, ці стане ён венчурным, бо нашыя інвестары шукаюць абароненасці. Улічваючы краінавую рызыку, эканамічную рызыку, палітычную рызыку — рызыкаваць яны не хочуць. А капітал у Беларусі ёсць, і яго дастаткова шмат.

**— У якасці альтэрнатывы зараз прапануецца выдзяленне бюджэтных грошай на цікавыя інавацыйныя праекты...**

— Ва ўсім свеце рэалізуецца прыватна-дзяржаўнае партнёрства, калі прыватны венчурны інвестар укладвае 25% капіталу, а дзяржава дадае 75% у падтрымку праекта. Атрымліваецца, што і дзяржава шмат не губляе, і бізнэс-анёл падстрахаваны. Калі такі механізм маецца на ўвазе, то гэта будзе выдатна.

**— Як сённяшняя эканамічная сітуацыя паўплывала на стартапы, на інвестараў, на жаданне інвеставаць?**

— Шосты стартап-уікэнд, які ў нас быў у канцы красавіка — пачатку мая, якраз пасля чарговай дэвальвацыі, паказаў некаторае зніжэнне прысутных на мерапрыемстве. Але колькасць праектаў пры гэтым засталася той жа самай. І былі дастаткова вартыя праекты, цікавыя для ўкладання. Ёсць яшчэ адзін важны момант — па нашых інвестарах не заўважна, што іх стан пагоршыўся: так, продажы знізіліся, стала больш цяжка, але, як правіла, у іх пастаўлены бізнэс. Калі ў латочніка замест 300% прыбытку стала 100% — гэта адно, а калі ў чалавека нармальна пастаўлены бізнэс з нармальным узроўнем кіравання, то гэта другое. Жаданне інвеставаць не знікла, таму калі ёсць цікавыя праекты ці ідэі, то не трэба баяцца — грошы ў краіне ёсць.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

### Даведка «Звязды»:

**Венчурныя інвестыцыі** — накіраваныя на фінансаванне новых ідэй, праектаў, а значыць — рызыкоўныя.

**Стартап (ад англ. start-up — запускаць)** — нядаўна створаная фірма. Як правіла, такія кампаніі знаходзяцца ў стадыі развіцця або даследавання перспектыўных рынкаў.

**Бізнэс-анёл** — прыватны інвестар, які ўкладвае грошы ў інавацыйныя праекты (стартапы) на этапе іх стварэння ў абмен на вяртанне ўкладанняў і долю ў капітале.

**Ликвидатор ЗАО «Энергосеть» – ЗАО «Правовая компания «Антикризисный консалтинг» – организатор публичных торгов – ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 07 сентября в 12.00 по адресу: г. Минск, пл. Свободы, д. 13/2, каб. 20 ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ СЛЕДУЮЩЕГО ИМУЩЕСТВА ЗАО «ЭНЕРГОСЕТЬ» ЕДИНЫМ ЛОТОМ:**

**Капитальные строения, расп. по адресу: Минская область, Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, д. 105 с комплексом оборудования по производству изделий из металла**

| | |
|---|---|
| Гараж общей пл. 102,8 кв.м, назначение: гараж (инвентарный номер 631/С-13224) | 60800000 |
| Гараж общей пл. 141,8 кв.м, назначение: гараж (инвентарный номер 631/С-13227) | 80500000 |
| Гараж общей пл. 42,5 кв.м, назначение: гараж (инвентарный номер 631/С-13226) | 29500000 |
| Административное здание общей пл. 310,3 кв.м, назначение: здание административно-хозяйственное (инвентарный номер 631/С-1812) | 225000000 |
| Бытовка общей пл. 60,4 кв.м, назначение: здание неустановленного назначения (инвентарный номер 631/С-13222) | 32900000 |
| Склад общей пл. 139,8 кв.м, назначение: склад (инвентарный номер 631/С-13232) | 82000000 |
| Склад общей пл. 152,4 кв.м, назначение: склад (инвентарный номер 631/С-13231) | 87000000 |
| Здание специализированное коммунального хозяйства общей пл. 137,1 кв.м, назначение: сауна (инвентарный номер 631/С-13230) | 97000000 |
| Проходная общей пл. 4,4 кв.м, назначение: проходная (инвентарный номер 631/С-13225) | 3000000 |
| Здание специализированное энергетики общей пл. 40,4 кв.м, назначение: здание специализированное энергетики (инвентарный номер 631/С-56856) | 29500000 |
| Здание цеха сборки общей пл. 269,9 кв.м, назначение: цех сборки (инвентарный номер 631/С-13234), **а также следующее имущество:** | 135000000 |
| Строение из сэндвич-панелей общей пл. 741,9 кв.м | 298000000 |
| Гидравл. башен. пробивной пресс с прогр. управ. Модель SKYB21225C, инв. №: 00000200 | 592000000 |
| Гидравл. листогиб. пресс WE67K-125-3200-DA65W, инв. №: 00000201 | 213500000 |
| Гидравлич. механ. ножницы QC11K-12X3200-DAC310, инв. №: 00000202 | 155900000 |
| Забор ж/б, инв. №: 00000183 | 42900000 |
| Цех покраски на производственной базе в г. Вилейке по ул. Шубина, 105, инв. №: 00000213 | 131800000 |
| Комплектное оборудование для обработки токопроводящих шин, инв. №: 00000147 | 32700000 |
| Компрессор М.11.01, инв. №: 00000185 | 2000000 |
| Компрессорная станция в г. Вилейка по ул. Шубина, 105, инв. №: 00000214 | 23100000 |
| Ножницы гильотинные , инв. №: 00000068 | 56000000 |
| Площадка, инв. №: 00000188 | 393000000 |
| Ручная листогибочная машина HS-7(s), инв. №: 00000065 | 28600000 |
| Сети внешнего электроснабжения производственной базы в г. Вилейке по ул. Шубина, 105, инв. №: 00000208 | 20000000 |
| Система отопления производственной базы в г. Вилейка по ул. Шубина, 105 , инв. №: 00000211 | 86200000 |
| Станок ленточный металлорежущий, инв. №: 00000062 | 16800000 |
| Станок СУПЕРТРОНИК, инв.№: 00000064 | 10500000 |
| Установка плазменной резки PC65 PLAZMA 400/3CE, инв. №: 00000140 | 7500000 |
| Полуавтомат сварочный ПДГ251СЭУ | 7800000 |
| Полуавтомат сварочный ПДГ251СЭУ | 7800000 |
| Сварочный полуастомат Jackle maxi MIG250 | 4500000 |
| Сварочный полуастомат Jackle maxi MIG300 | 4500000 |
| Станок вертикально-сверлильный | 7300000 |
| Станок токарно-винторезный | 18600000 |
| Трансформатор сварочный ТДН-250 | 600000 |

Стоимость лота составляет 3 023 800 000 (Три миллиарда двадцать три миллиона восемьсот тысяч) белорусских рублей, НДС по ставке 20 % в размере 604 760 000 (Шестьсот четыре миллиона семьсот шестьдесят тысяч) белорусских рублей, ИТОГО С НДС – 3 628 560 000 (Три миллиарда шестьсот двадцать восемь миллионов пятьсот шестьдесят тысяч) белорусских рублей.

Лот расположен на земельном участке общей площадью 1,2978 га, предоставленном для содержания и обслуживания зданий и сооружений по адресу: Минская область, Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, д. 105.

Заявки на участие в торгах принимаются до 18.00 **06 сентября 2011 года (включительно)** по адресу: г. Минск, пл. Свободы, д. 13, каб. 20.

По вопросам участия в торгах обращаться по тел. +375445757004. Задаток для участия в торгах – 10 % от стоимости лота.

Оплата задатка производится с даты настоящей публикации до **06 сентября 2011 года (включительно)** на расчетный счет ЗАО «Энергосеть»: р/с 3012006538011 в «Приорбанк» ОАО, код 749, УПН 100829703.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05 мая 2009 года № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Спецсхоў

# ГІСТОРЫЮ РОБЯЦЬ ЛЮДЗІ, А АРХІВЫ ТОЛЬКІ ЗАХОЎВАЮЦЬ ЯЕ

**Споўнілася 90 гадоў з дня заснавання партыйнага архіва ЦК кампартыі Беларусі. Перад намі лёс установы, якую простыя людзі амаль сем дзесяткаў гадоў несправядліва лічылі «спецсховішчам» тагачаснай улады.**

Яна нарадзілася ў 1921 г. для «збора і ўзяцця на захоўванне матэрыялаў па гісторыі станаўлення і распаўсюджвання ў Беларусі грамадскага і рэвалюцыйнага руху». Сярод пачынальнікаў работы па зборы ўспамінаў значацца старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А.Р.Чарвякоў, першы рэдактар «Звязды» А.Ф. Мяснікоў.

Беларускі партыйны архіў фарміраваўся і развіваўся як дакументальнае сховішча па гісторыі ўсяго народа Беларусі. Ужо першыя паступленні ў архіў тычыліся падзей, што адбываліся на тэрыторыях усіх пяці беларускіх губерняў.

У 1928 г., улічваючы памежнае становішча Мінска, было вырашана гістарычную частку архіва перавезці ў Магілёў, у памяшканне мясцовага аддзялення Музея рэвалюцыі БССР, у сталіцы ж засталіся дакументы да 1920 г.

У канцы 20-х гадоў партархівы СССР аб'ядноўваюцца ў «Адзіны партыйны архіў ЦК ВКП(б)». Адбылося гэта ў адпаведнасці з рашэннямі IV Усесаюзнай нарады кіраўнікоў гістпартаў і партархіваў, Сакратарыята ЦК ВКП(б) ад 28 чэрвеня 1929 г. Так пачынаўся новы этап у вывучэнні дакументаў найноўшай гісторыі СССР і яго рэспублік.

У Беларусі на аснове матэрыялаў партархіва былі падрыхтаваны і выдадзены першыя дакументальныя зборнікі: «Помнік змагарам рэвалюцыі, што загінулі за вызваленне Беларусі», «1905 год у Беларусі» і інш.

Не ўсё з таго, што ўбачыла свет, атрымала станоўчую ацэнку афіцыйных органаў улады. Крытыкавалася пропаведзь «двухкарэннасці паходжання КПБ» — ад РСДРП і Бунда. Яна была названа «праявай нацыяналістычнага ўхілу» з боку некаторых прадстаўнікоў Бунда. Пацверджана сувязь кампартыі Беларусі з ленінскімі бальшавіцкімі арганізацыямі, аснова якіх узнікае ў дні работы І-га з'езда РСДРП.

У 30-я гады партыйныя органы паглыбляюць паварот да эканомікі. У адпаведнасці з гэтым у ЦК КП(б)Б з'яўляюцца аддзелы прамысловасці і транспарту, сельскагаспадарчы, гандлю, школ і навукі і інш. Сярод ліквідаваных жаночы, галоўбюро яўсекцый, польбюро, латбюро.

Разам з ростам архіўных спраў павялічваецца колькасць абмежаванняў у іх навуковым выкарыстанні. Нельга не бачыць сувязі гэтай тэндэнцыі з дапушчэннем памылак у дзейнасці органаў улады.

У гэты перыяд выдадзена толькі 8 кніг і брашур. Найбольш адметныя з іх — «Пратаколы І з'езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі», «Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: зборнік успамінаў і артыкулаў».

Улічваючы цесныя творчыя сувязі паміж партархівам і Інстытутам гісторыі партыі і Кастрычніцкай рэвалюцыі назавём прозвішчы і гады працы некаторых відных дырэктараў Гістпарта: А.А.Сянкевіч (1929-1930), В.А.Сярбента (1930-1932), П.В.Савіч (1932-1933), І.А.Раманчук (1933), М.А.Ляўкоў (1933-1934), С.У.Пасэ (1934-1937), Я.Р.Пузароў (1937-1938).

У 1938 г. Інстытут ліквідуецца. Яго дакументы перадаюцца ў партархіў, у фонд пад нумарам 60. У цэлым жа напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў партархіве знаходзілася на захоўванні 226825 архіўных спраў.

Амаль 20 гадоў пасля перамогі над гітлераўскімі захопнікамі, дзень у дзень, ішла праца па камплектаванні ваенных дакументаў партархіва. У цэнтр былі пакладзены спісы ўдзельнікаў партызанскага і падпольнага руху. Падпольныя групы і арганізацыі таксама зацвярджаліся на падставе дакументаў ваеннага часу, успамінаў першых пасляваенных гадоў. Калі тая ці іншая асоба па нейкай прычыне не аказвалася ў спісах ваеннага часу, то яна павінна была сабраць тры пацвярджэнні і запоўніць Лісток па ўліку партызанскіх кадраў з баявой характарыстыкай. Правіла гэта падрыхтавалі і зацвердзілі ў першыя пасляваенныя гады аўтарытэтныя кіраўнікі вайны ў тыле ворага на акупаванай частцы СССР, у тым ліку і Беларусі. Яно застаецца дзейным і сёння. Любое яго парушэнне вядзе да дыскрэдытацыі паняцця «ветэран вайны».

Гісторыя партархіва ваеннага часу — гэта асобная тэма. Сярод першых ваенных паступленняў (1942) значыцца справаздача сакратара Мінскага падпольнага ГК КП (б)Б І.К.Кавалёва, імя якога амаль пяцьдзясят гадоў знаходзілася ў незаслужаным забыцці. Упершыню яно публічна названа на плошчы Перамогі 3 ліпеня 1996 г. у выступленні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі.

Вопыт беларускіх архівістаў па апрацоўцы партызанскіх дакументаў (стварэнне фондаў, вопісаў, архіўных спраў) знайшоў падтрымку ў пастанове ЦК КПСС «Асноўныя прынцыпы камплектавання фондаў у партыйных архівах», быў рэкамендаваны архіўным арганізацыям Украіны, Прыбалтыкі, Малдовы, заходніх абласцей РСФСР.

Рассакрэчванне доўгі час лічылася прэрэгатывай саюзных органаў улады. У канцы 40-х гадоў з дазволу бюро ЦК КП (б)Б доступ да ваенных матэрыялаў партархіва атрымалі кіраўнік органаў дзяржаўнай бяспекі БССР Л.Ф.Цанава, група пісьменнікаў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Яны рыхтавалі кнігі і артыкулы да 30-годдзя ўтварэння БССР і КП (б)Б. Але шырокая дэмакратызацыя ў дзейнасці партархіва пачалася толькі ў канцы 50-х — пачатку 60-х гадоў.

Нарматыўная база па выкарыстанні і рассакрэчванні архіўнай інфармацыі ў канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў стваралася ва ўмовах існавання псіхалагічнай і грамадска-палітычнай сітуацыі, выкліканай забаронай дзейнасці КПБ, распадам СССР, праявамі экстрэмісцкіх поглядаў на гісторыю.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В.Ф. Кебіч, былы першы сакратар ЦК кампартыі Беларусі А.А. Малафееў дапамаглі захаваць памяшканне і кадры партархіва.

З 24 верасня 1990 г. па чэрвень 1995 г. Беларускі партыйны архіў існаваў у форме Цэнтральнага партыйнага архіва КПБ. У яго склад увахозілі дакументы ЦК КПБ, ЦК ЛКСМБ, ЦК кампартыі Заходняй Беларусі, камісій партыйнага кантроля, падпольных партыйных і камсамольскіх органаў, Беларускага штаба партызанскага руху, арганізацый акупацыйнага рэжыму, копіі асабліва каштоўных матэрыялаў і дакументаў, якія знаходзяцца ў іншых айчынных і зарубежных архівах, архіўныя даведнікі (каталогі, картатэкі) і інш.

У лістападзе 1992 г. Цэнтральны партыйны архіў і Цэнтральны гістарычны архіў Беларусі аб'ядноўваюцца і ўтвараюць першы ў краіне Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ён дзейнічаў на аснове навукова-даведачнага апарата, які гістарычна склаўся, меў агульную дырэкцыю, у склад якой уваходзілі прадстаўнікі абодвух комплексаў.

У чэрвені 1995 г. Цэнтральны партыйны архіў як форма захоўвання і зберажэння дакументаў ліквідуецца. Яго фонды далучаюць да Белдзяржархіва (былы ЦГАКР БССР). Узнікае новая мадэль Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Партархіў — своеасаблівы пераемнік фармацыі. Аналагічныя дакументальныя сховішчы засталіся і дзейнічаюць у Расіі, Украіне, Казахстане...

Нельга не ўспомніць прымаўку — гісторыю робяць людзі, а архівы толькі захоўваюць яе. Гэта поўнасцю адносіцца да сённяшняга юбіляра — партыйнага архіва ЦК кампартыі Беларусі.

**Яўген БАРАНОЎСКІ, кандыдат гістарычных навук.**

## ЗНАЧНУЮ ЧАСТКУ БУРАЛОМАЎ УЖО РАЗАБРАЛІ

**З пачатку года ў лясным фондзе Мінлясгаса ўраганнымі вятрамі было пашкоджана больш за 1,2 мільёна кубічных метраў драўніны, з якіх 950 тысяч кубаметраў падлягаюць суцэльным санітарным высечкам.**

Значная частка ветравальна-бураломных лесасек ужо распрацавана, аднак да канца года неабходна высекчы яшчэ каля 600 тысяч кубічных метраў пашкоджанай драўніны, паведамілі ў прэс-службе Мінлясгаса. Акрамя таго, у зімовы перыяд трэба будзе засвоіць 40 тысяч кубаметраў драўніны ў цяжкадаступных участках. Нагадаем, ад моцных вятроў больш за іншыя пацярпелі лясы Мінскай вобласці, дзе ўтварылася каля 400 тысяч кубаметраў пашкоджанай драўніны. Вялікія аб'ёмы ветравальна-бураломных лесасек — каля 200 тысячы кубаметраў у кожнай — ёсць у Гродзенскай і Магілёўскай абласцях. Каля 100 тысяч кубаметраў пашкоджана ў лясах Гомельшчыны. Адпаведна, 30 тысяч і 10 тысяч кубічных метраў пашкоджанай драўніны трэба будзе прыбраць у Віцебскай і Брэсцкай абласцях. Трэба сказаць, што істотны ўрон стыхія нанесла і запаведным лясам: у двух нацыянальных парках — Прыпяцкім і Белавежскай пушчы — пашкоджана 268 тысяч кубаметраў. Увогуле на ліквідацыі наступстваў ураганаў зараз задзейнічана больш за 1,6 тысячы чалавек. Нарыхтаваная драўніна ідзе як на ўнутраны рынак, так і на экспарт.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Працяг тэмы: погляд

# ДА ЯКОЙ АДКАЗНАСЦІ ПРЫЦЯГНУЛІ АФІЦЭРАЎ ЗА ГІБЕЛЬ ЧАТЫРОХ ПАГРАНІЧНІКАЎ?

**Службовы «ГАЗ» з вайскоўцамі перакуліўся на слізкай дарозе. Людзей выкінула з аўтамабіля.**
**У кузаве разам з людзьмі перавозілі незамацаваныя бетонныя пліты, якія, па словах сведкі, выкінула на некаторых памежнікаў.**
**Да крымінальнай адказнасці прыцягнулі вадзіцеля — радавога Кананца.**
**Якую адказнасць панеслі людзі з зорачкамі на пагонах?**

Артыкул пра трагічную гібель памежнікаў пад Давыд-Гарадком быў надрукаваны ў «Звяздзе» паўгода таму *(«Чаму трагічна загінулі чатыры беларускія пагранічнікі», нумар за 1 сакавіка 2011 года).*

Машына з вайскоўцамі, якія ехалі абараняць дзяржаўную мяжу, перакулілася ў галалёд пад Давыд-Гарадком 18 снежня 2008 года. Чатыры памежнікі загінулі на месцы.

Як аказалася, службовы «ГАЗ» занесла на слізкай шашы, стукнула аб дарожны слуп, перакуліла. Людзей з кузава павыкідала — каго ў кювет, каго на асфальт. Загінулі прапаршчык Уладзімір Слуцкі, малодшы сяржант Андрэй Цупа, радавы Васіль Казакевіч і старшы сяржант Мікалай Трушко.

*«Кінуўся на дарогу, адзін пагранічнік ляжыць прама ўздоўж раздзяляльнай паласы, у яго, не пры нас кажучы, дзірка ў лобе, — распавёў журналісту «Звязды» непасрэдны сведка гэтай трагедыі. — А на грудзях — камянюка. Бардзюрная пліта. Яшчэ на хлопцаў высыпала маянез, батоны, спецыі, валялася зброя...»*

Матэрыял выклікаў розгалас. Па-першае, высветлілася, што службовым «ГАЗам» кіраваў радавы, які не меў правоў. Аднак кампетэнтныя афіцэры з пагранкамендатуры «Рэчыца» (ваенная часць 1235), нягледзячы на гэты абуральны факт, прызначалі такога кіроўцу перавозіць асабовы склад.

Па-другое, як паказала аўтатэхнічная экспертыза, тармазная сістэма «ГАЗа» не функцыянавала належным чынам. Але група тэхнічнага забеспячэння пагранкамендатуры за гэтым не прасачыла.

І самае галоўнае, разам з памежнікамі ў машыну загрузілі незафіксаваныя бетонныя пліты, зброю, скрыні з харчаваннем. Перавозіць такі груз разам з людзьмі ў адным кузаве забараняе ключавы дакумент, які рэгулюе падобныя пытанні, — *«Інструкцыя па арганізацыі эксплуатацыі аўтамабільнай тэхнікі».*

Але судзілі толькі вадзіцеля — радавога Кананца, па частцы 3 артыкула 464 крымінальнага кодэкса *(«Парушэнне правілаў кіравання альбо эксплуатацыі машын, якое пацягнула па неасцярожнасці смерць дзвюх альбо больш асоб»).*

Сваякоў загінулых пакрыўдзіла і тое, што ўсяго праз 12 дзён пасля гібелі чатырох пагранічнікаў, капітан А., які ехаў у трагічнай машыне і не прадухіліў парушэнні, атрымаў званне маёра. Маёр Дубойскі, які загадаў грузіць бетонныя пліты, таксама быў павышаны ў званні праз восем месяцаў пасля здарэння — стаў падпалкоўнікам. Камандзір вайсковай часці Б. быў пераведзены кіраваць іншым падраздзяленнем.

Сваякі загінулых памежнікаў звярталіся са скаргамі ва ўсе магчымыя інстанцыі і ўрэшце дамагліся, каб *у сакавіку 2010 была заведзена крымінальная справа ў дачыненні Мікалая Дубойскага, які на момант трагедыі ў званні маёра выконваў абавязкі каменданта пагранкамендатуры «Рэчыца».*

Але 15 лютага 2011 года Брэсцкі міжгарнізонны вайсковы суд апраўдаў афіцэра (Беларускі вайсковы суд 21 красавіка пакінуў гэта рашэнне без зменаў).

Калі наш папярэдні матэрыял пра гібель памежнікаў рыхтаваўся да друку, каментар «Звяздзе» даў намеснік старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Васіль Гарбаценка:

«Мы вельмі спадзяваліся на тое, што ў судзе ўсё будзе раскладзена па паліцах і вінаватыя будуць належным чынам пакараныя. Бліжэйшым часам мы, на падставе апошніх судовых пасяджэнняў, збяром усе дакументы, падвядзём канчатковыя вынікі. На мой погляд, вінаватыя людзі яшчэ будуць прыцягнуты да адказнасці, хоць і не крымінальнай. За тое, што машына была перагружаная, за тое, што вадзіцель не меў пэўнай катэгорыі, якая дазваляла б перавозіць такую колькасць людзей... Мы разгледзім правіну кожнага. Магчыма, мы збяром гэтых людзей разам і запросім матуль і жонак загінулых...»

Праз паўгода пасля выхаду папярэдняга матэрыяла пра трагедыю пад Давыд-Гарадком у рэдакцыю «Звязды» прыйшла афіцыйная папера за подпісам ЧВА Намесніка старшыні Дзяржпагранкамітэта — начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння палкоўніка Сяргея Байбарошы.


РЭПАРЦЁР 7
ЧАМУ ТРАГІЧНА ЗАГІНУЛІ ЧАТЫРЫ БЕЛАРУСКІЯ ПАГРАНІЧНІКІ?

Нам стала вядома, што падчас праверкі камісіяй Дзяржпагранкамітэта, якая праводзілася неўзабаве пасля аварыі, да дысцыплінарнай адказнасці было прыцягнута сем службовых асоб вайсковай часці 1235, уключна з камандзірам часці і яго намеснікам па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні.

Апроч гэтага, у адпаведнасці з загадам камандзіра вайсковай часці 1235, да дысцыплінарнай адказнасці былі прыцягнуты 4 службовыя асобы.

«...У цяперашні час прававых падстаў для паўторнага прыцягнення службовых асобаў вайсковай часці 1235 да дысцыплінарнай ці іншай адказнасці няма, — пазначана ў дакуменце. — Разам з тым хачу падкрэсліць, што з дадзенага здарэння ў органах памежнай службы былі зроблены вельмі сур'ёзныя ўрокі і высновы, каб не паўтарыць трагедыі ў будучыні.

Аднак мы разумеем, што апроч крымінальнай і дысцыплінарнай адказнасці, якую панеслі ваеннаслужачыя, на іх сумленні застанецца цяжкім грузам памяць пра чатырох загінулых саслужыўцах...»

Таксама ў дакуменце нямала згадак пра тое, як Дзяржпагранкамітэт дапамог пацярпелым сваякам фінансамі: «Свой удзел у аказанні фінансавай дапамогі сем'ям загінулых прынялі практычна ўсе ваеннаслужачыя органаў памежнай службы.

У 2009 годзе, напярэдадні гадавіны з дня гібелі, кожнай сям'і на набыццё помнікаў выдаткавана па 3000000 руб. з ахвяраванняў ваеннаслужачых. Па хадайніцтве Дзяржпагранкамітэта рашэннем Пінскага гарвыканкама ўдаве загінулага ваеннаслужачага Трушко Ю.Н. з жылога фонду горада выдзелена кватэра. Апроч гэтага, па асабістай просьбе Трушко Ю.Н. была прызваная на воінскую службу па кантракце на пасаду кантралёра аддзялення пагранічнага кантролю. Удава загінулага ваеннаслужачага Цупа Т.В. пасля сканчэння навучальнай установы была накіравана на працу па размеркаванні ў горад Гомель. Пасля звароту па дапамогу аб прадастаўленні жылля, па хадайніцтве камандавання Гомельскай пагранічнай групы ёй быў прадастаўлены інтэрнат у Гомелі.

У 2011 годзе, у адпаведнасці з рашэннем Пінскага гарадскога суда, з вайсковай часці 1235 на карысць сваякоў пацярпелых у якасці кампенсацыі маральных страт дадаткова спагнана 63 мільёны рублёў...»

Нядаўна ў рэдакцыю «Звязды» быў дасланы доўгі ліст ад бацькоў загінулага Андрэя Цупы. Хоць пра гэта нямала было напісана, Вера Канстанцінаўна і Іван Міхайлавіч у чарговы раз ставяць пытанне рубам: *«Чаму за смерць сына адказаў толькі вадзіцель, які парушыў правілы дарожнага руху? Яго ж, чалавека без правоў, пусцілі за руль афіцэры. Людзі з зорачкамі на пагонах загадалі ў парушэнне заканадаўства грузіць у кузаў бетонныя пліты. Але асуджаны толькі радавы, а афіцэры працягваюць ахоўваць дзяржаўныя межы...»*

**Яўген ВАЛОШЫН.**

